СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск—5.10, 21.20, 16.10;
Віцебск—4.54, 21.17, 16.23;
Магілёў—4.59, 21.09, 16.10;
Гомель—5.05, 20.58, 15.53;
Гродна—5.28, 21.33, 16.05;
Брэст—5.34, 21.28, 15.54.

МЕСЯЦ:
Апошняя квадра 23 ліпеня.

ІМІНІНЫ:
Прокла, Міхала, Хведара, Івана, Арсеня, Гаўрылы; Якуба, Крыштафа.

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

25 ЛІПЕНЯ 1992 г.
субота, № 148 (21926)

● цана 1 рубель

ГЭТА САЛОДКАЕ СЛОВА—НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ...

27 ліпеня Рэспубліка Беларусь упершыню адзначыць сваё нацыянальнае свята—Дзень незалежнасці

Чалавек — гучыць горда! Памятаеце гэты выраз? Не адно дзесяцігоддзе ён, паводле нашых перакананняў — і найперш ідэалагічных, клікаў і вёў нас наперад, нібыта — у светлую будучыню. А спахапіліся і высветлілася: ішлі і, урэшце, прыйшлі мы, мякка кажучы, не туды... І чалавек у нас, як стала відавочна, далёка не першая наша гордасць.

Дзякуй Богу, што ўсё ж спахапіліся: як кажуць, лепш позна, чым ніколі. І калі два гады назад сесія Вярхоўнага Савета рэспублікі прыняла Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі, а 25 жніўня 1991 года нечарговая сесія ВС прыняла Закон аб наданні гэтай Дэкларацыі статуса канстытуцыйнага закона, мы нібыта набылі другое дыханне — глыбокае, свежае, сапраўды чалавечае і цывілізаванае.

Так, без Свабоды, Незалежнасці чалавек ніколі не быў і не стане Асобай. Такой асобай, якой, самастойна акрэсліўшы для сябе як прынцыпы жыцця і дзейнасці тыя ж свабоду і незалежнасць, стаў, скажам, Андрэй Сахараў. Роўных жа ці блізкіх да яго Асоб—па інтэлекту і кругагляду, шчырасці перад народам і вернасці яму, самаадданасці і самаахвярнасці ў імя яго, народа, жыцця і мэт, — у нас, на жаль, пакуль што няма... А такія людзі патрэбны, яны — без перабольшання — нашы маякі, пуцяводныя поркі...

...Незалежнасць і суверэнітэт Рэспублікі Беларусь узаконены, пасля заўтра мы ўпершыню будзем святкаваць гэта. Але ж што робім мы — усе разам і кожны паасобку, каб стала Айчына па-сапраўднаму свабоднай і самастойнай, каб народ наяву пачаў «людзьмі звацца»...

Няхай даруе мне чытач за несвяточны тон наступных выказванняў, але... Але робім мы сёння далёка не ўсё і не ўсюды ў імя сапраўднай Незалежнасці, сапраўднага Суверэнітэту Беларусі.

Пайшоў, так бы мовіць, гуляць у прамовах высокапастаўленых кіраўнікоў і нават вядомых палітычных дзеячаў, па старонках друку, перадачах тэлебачання і радыёвяшчання выраз: «Трэба напаўняць незалежнасць рэспублікі рэальным зместам» ...Ён нібыта і ясны, зразумелы. Толькі вось дакуль будзем мы жыць па гэтаму «ўсемагутнаму» «трэба»? Дзе, урэшце, канкрэтныя прыклады гэтага напаўнення?

Яны ёсць. Аднак — кволыя, нясмелыя, нярэдка — малазначныя і невыразныя. А першыя ж кроку — пачатак шляху: вялікага, складанага, супярэчлівага... Вось пагэтаму і рабіць іх трэба рашуча, ўпэўнена, смела!

Атрымліваецца ж, на жаль, іншы раз і наадварот.

Усяго два з палавінай гады назад — у студзені 1990-га — прыняты Закон аб мовах у рэспубліцы. ЗАКОН, у якім дакладна занатавана, што дзяржаўнай мовай Беларусі з'яўляецца беларуская мова... БЕЛАРУСКАЯ, якая ж яшчэ! Але ўжо сёння ў рэспубліцы пэўныя сілы ўсё актыўней разгортваюць рух за прызнанне ў ёй... двухмоўя. І гэты рух падтрымліваецца нават асобымі сродкамі масавай інфармацыі. Так і хочацца ўсклікнуць: дык што ж гэта робіцца?!

Не, не паспрыяе гэта нашай незалежнасці, суверэнітэту. Як не спрыяе і прамаруджванне з уводам нацыянальнай валюты; прыватызацыяй дзяржаўнай маёмасці, зямлі, жылля; больш шырокім адкрыццём доступу ў эканоміку замежных інвестараў і г. д., і да т. п. Толькі самастойнасць, свабода дзейнняў павінны стаць сёння спадарожнікамі нашых планаў і задум, рашэнняў і дзейнняў. Тады і толькі тады і зойме Рэспубліка Беларусь «свой пачэсны пасад між народамі», а сама яна будзе карыстацца павагай і аўтарытэтам у свеце.

...Салодкае яно слова — незалежнасць. Але дзеля яе трэба працаваць, дзейнічаць!

Анатоль МЯСНІКОЎ.

«НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ, ПАСЛЯДОЎНАСЦЬ, ЗГОДА— ШЛЯХ, які павінны прайсці дзяржава і кожны з нас»

«Прамая лінія» Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслава ШУШКЕВІЧА з чытачамі газеты «Звязда»

— Станіслаў Станіслававіч, звоніць Мікалай Міхайлавіч ЛІСІЦКІ. Чаму ў Мінску, не кажучы ўжо аб правінцыі, немагчыма знайсці тавараў з беларускай дзяржаўнай сімволікай, не часта сустрэнеш дзяржаўныя сімвалы і ў афармленні гарадоў і вёсак?

— Пытанне зусім не другараднае — гэта вельмі істотная праблема. Нядаўна мы стварылі спецыяльную камісію, якая займаецца яе вырашэннем. Абяцаю, што пытанне будзе пастаўлена самым катэгарычным чынам і становішча выправіцца.

Ігар ГОРЫН (г. Горкі):

— Вашы адносіны да ідэі неадкладнага ўвядзення паста Прэзідэнта Беларусі?

— Цяперашняя Канстытуцыя, як вядома, не прадугледжвае гэту пасаду. Што асабіста да мяне, то я — не прыхільнік падобных тэрміновых змен. Наўрад ці гэта карэнным чынам можа палепшыць становішча.

Уладзімір Міхалаевіч ГАНЧАРОЎ (г. Мінск):

— Ці ёсць у Вас свая каманда?

— Ёсць. Але каманда можа быць роэнай. Для прапрацоўкі кожнага пытання ствараецца група сумленных, кваліфікаваных людзей, з якімі я працую па эканамічных і палітычных пытаннях. Але іх вямнога.

— Калі можна, назавіце прозвішчы.

— А гэта ўжо, прабачце. Я не хацеў бы ставіць іх у няпростае становішча.

Мікола ГАУРУСЕЎ (г. Баранавічы):

— Чаму мы працягваем настойліва рухацца да Масквы? Мы толькі што вызваліліся з гэтых абдымкаў і зноў туды імкнёмся. А як жа суверэнітэт?

— Не разумею, што вы маеце на ўвазе?

— Чаму войскі, якія выводзяцца з Усходняй Еўропы, размяшчаюцца ў нас?

— Скажыце, калі ласка, а як будзем вырашаць пытанне з тымі войскамі, якія на нашай тэрыторыі? Яны ж не ўсе беларускія. Тут ёсць войска, якое лагічна паставіць пад расійскі флаг. Вы згодны з гэтым?

— Так.

— Калі згодны, дык давайце вырашаць праблему цывілізаваным шляхам, шляхам перагавораў, а не ультыматумаў. Менавіта гэта робіць у Маскве наш урад і наша Міністэрства абароны.

— Калі ісці такім шляхам, то зноў створым Саюз?

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

— Я не ведаю, што вы маеце на ўвазе. Саюза ў нас няма, ёсць — Садружнасць.

— Станіслаў Станіслававіч, вось яшчэ што хвалюе. Перахаваны: дзе прайшоў бальшавік, беларусу няма чаго рабіць. Калі зноў абудзяцца камуністычныя сілы, то ўсе нацыянальныя праблемы адыдуць у нябыт.

— А што тады рабіць з тымі, хто быў бальшавікамі? Іх жа больш, чым паўмільёна. Давайце жыць па-людску. Там, дзе яны памыляліся, дапаможам ім стаць на правільны шлях.

— А як жа Дзень незалежнасці: ён набліжаецца, а святкаваць яго ніхто не збіраецца?

— Свята гэта для людзей, а не для афіцыяльных асоб. Глядзіце тэлевізар з чатырох гадзін дня і вы ўбачыце рэпартаж са свята. Можаце ўдзельнічаць у святкаванні каля філармоніі ў Мінску і ў іншых месцах рэспублікі. Добрага вам свята. Усяго найлепшага.

Іван Мікалаевіч ГУДКОЎСКІ:

— Чаму практычна выраўнены пенсіі тых, хто працаваў доўга і добра, і хто не зусім?

— Гэта сур'ёзнае ўпушчэнне ў заканадаўстве і над гэтай праблемай працягваюць працаваць камісіі Вярхоўнага Савета. Думаю, што справа будзе вырашана ўжо ў гэтым годзе. Трэба падумаць пра тых людзей, якія сумленна працавалі многія гады, але зараз іх пенсіі амаль выраўнены з тымі, хто працаваў менш эфектыўна. Калі б нам удалося паправіць эканоміку, то і сацыяльныя праблемы вырашаліся б больш справядліва.

Іван Цімафеевіч ПАЛЯКОЎ, інвалід вайны II групы, г. Мінск:

— У Мінску ёсць інваліды Вялікай Айчыннай вайны, якія доўгі час стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. Ці можна спадзявацца, што яны атрымаюць кватэры да 93-га года? Ці не адракуцца ўрад і Вярхоўны Савет ад сваіх запэўніванняў па падтрымцы людзей?

— Наконт 93-га года надзея даволі слабая. Аб'ёмы будаўніцтва істотна скарочаны. Чарнобыльскія праблемы вам таксама вядомыя...

— Але ж, магчыма, ёсць нейкія рэзервы?

— Аб'ёмы дзяржаўнага будаўніцтва вельмі скарочаны. Асноўны крэн зараз будзе на індывідуальнае будаўніцтва, каб людзі будавалі сваё жыллё сваімі сіламі. Я разумею, што для інвалідаў гэта непрымальна. Але я не магу даць вам гарантыю, што вы атрымаеце кватэру ў 93-м годзе. Гэта канкрэтная сітуацыя патрабуе канкрэтнага вырашэння.

— Скажыце, а курс урада не пераменіцца?

— Справа не ў курсе ўрада, таму што ўрад не можа «нарадзіць» грошы, сродкі. Пытанне ў курсе ўсяго грамадства: альбо мы пачнём развіваць нашу эканоміку і тады ўсе нашы справы пачнуць рухацца. Калі ж яны будуць ісці так, як цяпер, то перспектыва вельмі сумная — я вам прама кажу. На жаль. Давайце імкнуцца рабіць лепш.

Вячаслаў Віктаравіч СВІЗУНОЎ (г. Бабруйск):

— Трэба ў новую Канстытуцыю абавязкова ўвесці артыкул або раздзел аб механізме ўступлення ў дзеянне законаў на тэрыторыі Беларусі. Каб кіраўнікі выконвалі законы на наступны дзень, а не чакалі «тлумачанняў» мясцовых органаў, якія ў выніку зводзяць гэтыя законы на нішто, і каб адказнасць за іх парушэнне была вельмі строгай.

— Я магу падпісацца пад вашымі словамі: законы трэба выконваць. Але калі мы пачнём не разабраўшыся як след выганяць з работы, прыцягваць да крымінальнай адказнасці, то, баюся, што прыйдзецца ствараць рэпрэсіўны апарат, ад якога мы адышлі. Прынцып у вас правільны: калі не будзем выконваць закон, не пабудуем прававую дзяржаву.

— Мяне вельмі хвалюе, у прыватнасці, чаму ў Бабруйску не выконваецца закон аб мовах. Нехта ж вінаваты ў гэтым?

— На жаль, ён і ў Мінску вельмі часта не выконваецца. Што ж, давайце працаваць, каб ён выконваўся без бойкі. Я гарачы прыхільнік строгага падыходу да выканання гэтага закона. Калі не выконвае яго канкрэтная ўстанова, трэба прыцягваць да адказнасці. Агулам жа гаварыць вельмі цяжка.

— Але ж патрэбна дапамога на дзяржаўным узроўні.

— Што ж, будзем дапамагаць, але і без вашай дапамогі не абысціся. Вы ж гаворыце па-беларуску і мне прыемна вас чуць. Тры гады таму такога фактычна не было. Гэта ўжо арух. Давайце рухацца далей. Жадаю вам поспехаў.

Аляксандр Алегавіч БАРАВІЦКІ (г. Мінск):

— Ці існуе пагроза незалежнасці Беларусі?

— Вы ведаеце, я не лічу, што незалежнасці Беларусі нічога не пагражае. Пагражаюць унутраныя праблемы: нежаданне многіх людзей зразумець тое, што адбываецца, а часта і неразуменне імі таго, што адбываецца. Стэрэатыпы моцна сядзяць у галовах. Таму трэба пэўнае цярпенне. Важна, каб вонкавыя праблемы вырашаліся толькі палітычнымі метадамі, а ўнутраныя — спосабам выхавання, агітацыі.

Мы здольныя ўладкаваць усе пытанні палітычнымі метадамі і з нашымі суседзямі. Вы бачыце, як мы гэтым займаемся. Праблемы трэба вырашаць беларускай меншасці за мяжой і нацыянальных меншасцей у нас. А вялікадзяржаўныя амбіцыі... Ведаеце, усё паступова ўладкоўваецца. Калі тлумачыць людзям, не ганьбіць іх, не лічыць, што сітуацыя невыпраўляльная — пытанні вырашаюцца. Вы сведка таго, што мы імкнёмся вырашаць іх па-людску, чалавечымі метадамі.

Канстанцін Ільіч ДАМАРАД, старшыня Савета ветэранаў партызанскага руху Мінскай вобласці:

— Ці маеце Вы намер унесці на чарговай сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі пытанне аб адмене пастановы аб часовым спыненні дзейнасці кампартыі Беларусі — тым больш, што гэта прапанова ўнесена Вамі?

— Я такога намеру не маю. Няма ў гэтым неабходнасці. Створана і зарэгістравана Партыя камуністаў Беларусі, якая мае ўсе магчымасці для нармальнага функцыянавання. Ніхто не чыніць перашкоду ў яе дзейнасці. Яна мае доступ да сродкаў масавай інфармацыі. Чаму ёй павінны быць пераваги перад іншымі партыямі?

— Але ж я меў на ўвазе захаванне правапераемнасці кампартыі...

(Заканчэнне на 2-й стар.).

ДЗЕЦІ «БЯГУЦЬ» З ГОРАДА

МІНСК. Літаральна ўсе бацькі стараюцца летам адправіць сваіх дзяцей далей ад шумнага і душнага горада, дзе іх нашчадкі маглі б паўнацэнна правесці канікулы. Для гэтага ў наваколлях Мінска распачалі работу 152 лагеры дзённага знаходжання дзяцей малодшага і сярэдняга ўзросту, 31 загарадны лагер, 48 лагераў працы і адпачынку, 16 профільных лагераў. Вырашана пытанне аб бясплатным выдзяленні палавіны пуцёвак у гэтыя ўстановы. Вось толькі ці хопіць іх усім жадаючым?

Алімпіяда запрашае на свята

Сёння ў Барселоне ўспыхне алімпійскі агонь. Пачнецца галоўны спартыўны турнір свету — Гульні XXV Алімпіяды.

Алімпійскія гульні — гэта заўсёды не толькі спаборніцтвы, а і свята. Свята маладосці, таленту, прыгажосці, спрыту, мужнасці, майстэрства... Нездарма ж з нецярпеннем і вялікімі спадзяваннямі і надзеямі чакаюць яго мільёны спартсменаў, аматараў спорту. Алімпійскі дэвіз: «Хутчэй, вышэй, мацнейі» сапраўды авалодаў усёй планетай.

Для каманды СНД старты ў Барселоне адметныя ў многім. І справа не толькі ў тым, што яна ў сваім традыцыйным, «інтэрнацыянальным», складзе выступіць у апошні раз, хоць і гэта, вядома ж, характэрна не толькі для яе, а і для ўсяго сусветнага алімпійскага руху. Спаўняецца юбілей — роўна 40 гадоў назад савецкія алімпійцы наогул упершыню выйшлі на старты па праграме Алімпіяды. Тады ж, у 1952-м, дэбютавалі ў саставе зборнай СССР і беларускія спартсмены. Іх было ўсяго сем чалавек — тых, хто пракладваў дарогу беларускаму алімпізму. Нагадаем імёны гэтых першапраходцаў: лёгкаатлеты Міхаіл Крываносаў, Анатоль Юлін, Цімафей Лунёў і Міхаіл Салтыкоў, фехтавальшчыкі Герман Бокун і Юрый Джэксбах, вясляр Стэфан Міхайлаў. І хоць лепшы з іх—А. Юлін заняў тады ўсяго толькі чацвёртае месца ў бегу на 400 метраў бар'ерамі, слава аб беларускіх алімпійцах пайшла неўзабаве па ўсёй Зямлі.

Сённяшняму пакаленню алімпійцаў ёсць з каго браць прыклад, на каго раўняцца... Не адзін год славілі нашу рэспубліку сваімі талентамі і выдатным майстэрствам, воляй да перамогі трохразовыя алімпійскія чэмпіёны Аляксандр Мядзведзь і Вольга Корбут, Алена Бялова і Уладзімір Парфяновіч; «залатыя» лаўрэаты Алімпіяд Алег Караваеў, Рамуальд Клім, Тамара Лазаковіч, Іван Ядзешка, Антаніна Кошаль, Валерый Шарый, Уладзімір Камінскі... А ўсяго прадстаўнікі Беларусі атрымалі на Гульнях у Мельбурне і Рыме, Токіо і Мехіка, Мюнхене і Манрэалі, Маскве і Сеуле 44 медалі вышэйшай пробы. Так што не выключана, што ў Барселоне наша дэлегацыя будзе ўшаноўваць юбілейнага, 50-га чэмпіёна! Хто ім стане! Прагноз у спорце — справа не зусім удзячная, але не ў прагнозе зараз справа. Галоўнае, каб гэты сапраўдны герой спорту быў...

І ён, несумненна, будзе!

...Не да святаў нам сёння — скажа іншы чытач. Так, за змрочнымі і заблытанымі буднямі мы і сапраўды пачынаем адвыкаць ад зямных, цывілізаваных даброт і радасцей. Але давайце хоць заўтра, на момант «забыўшыся» пра неўладкаванасць і непарадкі на вытворчасці і ў быце, пра чэргі і выбрыкі новай бюракратыі, пра іншыя бядоты і непаразуменні, успомнім, што ёсць на свеце і тое, што вышэй за ўсё гэта. І, уключыўшы тэлевізары і радыёпрыёмнікі, паглядзім і паслухаем рэпартажы з ўрачыстай цырымоніі адкрыцця XXV Алімпійскіх гульняў. Мы ўпэўнены: у вас пасвятлее на душы і ў сэрцы...

СВЯТА — ЯНО БЫЛО, ЁСЦЬ І БУДЗЕ СВЯТАМІ

(Чытайце 3-ю старонку «Звязды»).

ПАНЯДЗЕЛАК—ДЗЕНЬ ЗУСІМ НЕ ЦЯЖКІ. КАЛІ ЁН СВЯТА

І пачнецца свята ўжо напярэдадні, у нядзелю ў 10.00 спартыўна-мастацкім прадстаўленнем на стадыёне «Уручча». А 27-га, у панядзелак—непасрэдна ў Дзень незалежнасці—за падзеямі толькі паспявай сачыць:

10.00—ускладанне вянкоў і кветак да абеліскаў на плошчы Перамогі, «Мінск—горад-герой», да помнікаў і на ваенных могілках.

15.00—у парках імя Горкага, Чэлюскінцаў, 50-годдзя Кастрычніка, на плошчы Якуба Коласа адбудуцца выступленні майстроў мастацкай самадзейнасці.

17.00—святочны канцэрт у скверы Янкі Купалы; у той жа час у Канцэртнай зале Белдзяржфілармоніі—урачыстае пасяджэнне, прысвечанае Дню незалежнасці, і святочны канцэрт майстроў мастацтваў Беларусі.

21.00—22.00—на праспекце Машэрава, у парку Горкага і ў скверы Я. Купалы будуць іграць духавыя аркестры Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. А завершыцца ўсё святочным феерверкам—у 22.00.

У Дзень незалежнасці Беларусі, 27 ліпеня ўправа БНФ правядзе свае мерапрыемствы, мэта якіх вызначана так: «Ад дэкларавання суверэнітэту — да сапраўднай незалежнасці».

У 10.00 на плошчы Незалежнасці пачнецца шэсце па праспекце Ф. Скарыны да сквера Я. Купалы, дзе ў 11 гадзін з ускладання кветак да помніка песняру пачнецца мітынг.

БелаПАН.

ЗАГАД
міністра абароны Рэспублікі Беларусь

17 ліпеня 1992 г. **№ 73** *г. Мінск*

Таварышы салдаты, сяржанты і старшыны, прапаршчыкі, афіцэры і генералы!

Паважаныя ветэраны і партызаны Вялікай Айчыннай вайны!

Дарагія суайчыннікі!

Рэспубліка Беларусь адзначае другую гадавіну дзяржаўнай незалежнасці. Шлях да яе быў цяжкім і доўгім. Незлічоныя ахвяры за свабоду, за права быць гаспадаром на сваёй зямлі панёс беларускі народ.

Назаўсёды захаваецца памяць аб тых, хто адстаяў і збярог Айчыну!

Веліч духу народа — залог умацавання незалежнасці Рэспублікі Беларусь, яе развіцця і працвітання.

Узброеныя сілы як адна з важнейшых структур дзяржаўнасці праходзяць сваё станаўленне. Іх асабовы састаў захоўвае вернасць беларускаму народу, робіць усё, каб забяспечыць баявую гатоўнасць войск за ўмовах правядзення ваеннай рэформы, карэнных змяненняў ваеннай службы.

Сардэчна віншую ваеннаслужачых, ветэранаў са святам — Днём незалежнасці!

Жадаю добрага здароўя, поспехаў у службе, асабістага шчасця і дабрабыту!

У азнаменаванне свята Дня незалежнасці загадваю: 27 ліпеня 1992 года ў 22 гадзіны зрабіць святочны феерверк у сталіцы Рэспублікі Беларусь горадзе-героі Мінску і ў крэпасці-героі Брэсце.

Вечная слава героям, якія аддалі сваё жыццё за свабоду і незалежнасць Айчыны!

Няхай жыве мужны беларускі народ!

Міністр абароны Рэспублікі Беларусь, генерал-палкоўнік П. КАЗЛОЎСКІ.

«НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ, ПАСЛЯДОЎНАСЦЬ, ЗГОДА— шлях, які павінны прайсці дзяржава і кожны з нас»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

— Паўтаруся, з такімі прапановамі я выступаць не буду. Думаю, што дзейнасць любых грамадска-палітычных арганізацый, якая не супярэчыць агульначалавечым нормам маралі, свабодная.

— Следства ўстанавіла, што КПБ і яе кіраўнікі да жнівеньскіх падзей не мелі дачынення.

— Устанавіць гэта можа толькі суд. А тое, што зараз людзі з камуністычнымі пераканаммі могуць свабодна аб'ядноўвацца ў грамадскую арганізацыю, факт. І гэту магчымасць можа скарыстаць кожны.

— І ўсё ж, Станіслаў Станіслававіч, як быць з раздзелам маёмасці?

— Гэта дзяржаўная маёмасць!

— Не — партыйная.

— Вы мяне прабачце. Чытайце старую Канстытуцыю. Партыя была дзяржаўнай структурай. Што-што, а гэта я добра ведаю: партыя блытала сваю кішэню з дзяржаўнай. І гэтаму мы паклалі канец. Маёмасць партыі вернута дзяржаве — гаспадару.

— Але ж народ прытрымліваецца меркавання: тое, што КПБ брала з дзяржаўнага бюджэту, вярнуць, а тое, што было партыйнай маёмасцю, аддаць партыі. Дзяржава сваё атрымала, павінна атрымаць і партыя.

— Яна брала з дзяржаўнага бюджэту так многа... Па маіх ацэнках, тая былая маёмасць кампартыі, якая перададзена дзяржаве, значна меншая той маёмасці, што выкарыстоўвалася. А кіраўнікі ўсіх рангаў, груба кажучы, шмат праелі, праматалі, прагулялі... Канешне, радавыя камуністы тут ні пры чым. Яны былі проста падманутыя. Але справядлівасць адноўлена. Я сказаў бы так: дзяржава атрымала тое, што ёй належыць.

Іван Віктаравіч СЦЯПУРА (г. Асіповічы):

— У Магілёўскай вобласці ўсе халадзільнікі «забіты» мясам, а ў магазінах яго не хапае. Што прадугледжана для вырашэння гэтай праблемы?

— Вы добра разумееце сітуацыю. У нас ёсць перапоўненыя мясам халадзільныя ёмістасці, што, сапраўды, паралізавала работу. Але справа не ў гэтым. У крамах мяса няма таму, што крамы яго не бяруць, яны — непрыватызаваныя. На жаль, урад не надта эфектыўна працуе, каб у першую чаргу правесці прыватызацыю гандлю, сферы паслуг. Ды і заканадаўчае забеспячэнне гэтага пакуль не на ўзроўні. Мы павінны працаваць над яго ўдасканаленнем. Але рабіць штосьці процізаконнае мы не маем права. Праблему не вырашаць толькі Старшыня Вярхоўнага Савета альбо Прэм'ер-міністр. Гэта павінна быць работа мясцовых улад. Бо ў вас на месцы ёсць мяса, і ёсць крамы, і ёсць улада.

Андрэй ВОЎЧЫК, канструктар (г. Гродна):

— Чаму дзеці, пачынаючы з другога класа, разам з беларускай і замежнай павінны вывучаць яшчэ і рускую мову,— гэта залішне вялікая нагрузка для іх?

— Вы дрэнна думаеце пра магчымасці дзяцей. Тое, на што ў сталым узросце патрэбны гады,— у маленстве мы адольваем за лічаныя месяцы. І як педагог, і як чалавек, які ў дзяцінстве вывучыў дзве-тры мовы,— я вас запэўніваю, што гэта няцяжка.

Ці варта ў тэрміновым парадку мяняць мову выкладання ва ўсіх галінах? Я б не хацеў, каб Вы былі залішне катэгарычным у гэтым пытанні. Давайце дадзім спецыялістам магчымасць вызначыць, што трэба пераводзіць на беларускую мову ў першую чаргу, а што — пачакаўшы.

Як фізік, я, магчыма, скільны да таго, каб фізіку ў нас увогуле выкладалі па-ангельску. Таму тут трэба падумаць, дзе і з якой хуткасцю ў галіне прыродазнаўчых навук мы павінны адштурхоўваць тую мову, з якой звыкліся. Баюся, каб гэта не пайшло на шкоду навуцы. Вырашаючы моўную праблему, не трэба забываць праблемы прафесійныя.

І ідзе беларусізацыі, і Закон аб мовах — добрыя. І я ўсяляк падтрымліваю іх. Але не дай нам Бог скампраметаваць ідэю,— гэта будзе вельмі дорага каштаваць.

— Чаму войскі з Усходняй Еўропы, якія ўзяла пад сваю юрысдыкцыю Расія, прымае на сваёй тэрыторыі Беларусь? Няўжо мы не можам адмовіцца ад іх?

— Наша краіна — адна з праваперавемнікаў былога Саюза. І Вярхоўны Савет, і яго Прэзідыум дэталёва аналізавалі гэту праблему. Так, дагавор, падпісаны Э. Шэварднадзе ў таямніцы ад Беларусі, быў далёка не дасконалы. Але зруйнаваць яго, на жаль, нельга. Гэта наша цяжкая спадчына. Мы апынёмся ў яшчэ больш складаным становішчы, калі патрабуем праігнараваць яго.

— Колькі часу спатрэбіцца нам, каб вывесці расійскія войскі са сваёй тэрыторыі і рэарганізаваць уласныя Узброеныя Сілы?

— Ідзе размова пра сем гадоў. Гэта тэрмін, на працягу якога мы гарантуем на самым высокім міжнародным узроўні, што збожжа войска будзе даведзена да колькасці, не большай, як сто тысяч чалавек. Мяркую, што тэрмін гэты будзе карацейшы. Ды і колькасць ваенных у Беларусі можа быць меншай, — лічбы гэтыя прыблізныя, арыенцівачныя. Але трэба слухаць і прафесіяналаў, якія гавораць пра тое, што абараназдольнасць краіны не можа зніжацца да крытычнай адзнакі.

Станіслаў КАРАЦКІ, інжынер (г. Мінск).

— Як можна аддаваць сваіх сыноў у армію неіснуючай імперыі? Афіцэры ж на тэрыторыі Беларусі не прынялі прысягу на вернасць нашай краіне?

— Я — прыхільнік таго, каб афіцэры прынялі прысягу на вернасць той дзяржаве, якой служаць. Але давайце ўлічваць цяжкую перадгісторыю. Я ўпэўнены, што да наступнай гадавіны Незалежнасці гэта пытанне будзе знята па ініцыятыве саміх афіцэраў. Гэта ініцыятыва ўжо ёсць.

— Чаму Кебіч падпісаў у Ташкенце дакументы ў галіне культуры з тымі краінамі, якія адмаўляюцца вяртаць нашы нацыянальныя культурныя каштоўнасці?

— Ніякіх дагавораў, якія б ставілі пад сумненне нашы правы на нацыянальныя каштоўнасці, міводзін прадстаўнік урада ці Вярхоўнага Савета нідзе не падпісваў.

Валерый ЛАПАЦІН (г. Мінск):

— Колькі яшчэ Беларусь будзе марудзіць з увядзеннем уласнай валюты? Пара чаканіць беларускія грошы, у тым ліку разменную манету, якой цяпер так не хапае.

— Пры нашым узроўні інфляцыі самай дробнай разменнай манетай, відаць, хутка будзе рубель. Чаканіць уласныя грошы, бадай, пакуль што рана, але быць падрыхтаванымі да гэтага трэба.

Тэхнічны аспект тут — далёка не самы галоўны. Мы пакуль што не маем сродкаў, каб забяспечыць стабільнасць будучай уласнай валюты. Трэба гэтыя сродкі займець, зарабіць — тады зможам уводзіць уласныя беларускія грошы.

Юры СВІРКО, супрацоўнік агенцтва БелаПАН (г. Мінск):

— Чаму на Беларусі так шмат афіцыйных газет, падпарадкаваных ураду?

— Пытанне зусім слушнае — у мяне таксама такое ўражанне, што адбываецца шалёная манапалізацыя нашай прэсы. Мне здаецца, што шчырыя сумленныя журналісты трапілі ў невялікую пастку. Трэба выпраўляць такое становішча. Думаю, што ў блізкім будучым мы гэта зробім.

— Вашы адносіны да сучаснага правапісу беларускай мовы. Ці згодныя Вы, што яго трэба мяняць?

— Я пакуль што карыстаюся тым правапісам, які вывучаў у школе. Адчуваю, што ён русіфікаваны, але іншым проста не валодаю. Думаю, што сваё слова ў мэтазгоднасці змен павінны сказаць спецыялісты.

Міхаіл ЯСКЕВІЧ (г. Магілёў):

— Мы ў сябе на вытворчасці ўкаранілі АСК, якая не выкарыстоўваецца. Дапамажыце адолець супраціўленне бюракратаў.

— А што Вы самі зрабілі для таго, каб яна працавала? А-а, Вы лічыце, што самі Вы нічога не можаце зрабіць, а вось я адсюль, з Вярхоўнага Савета, па вашай канкрэтнай сістэме кіравання грамадскім транспартам магу нешта зрабіць. Гэта ж нелагічна... А як гарадскія ўлады да гэтага ставяцца?

Гэта канкрэтная праблема, якая патрабуе канкрэтнага разгляду. А ўвогуле, напэўна, пакуль не адбудзецца кардынальная рэарганізацыя нашай транспартнай гаспадаркі, — справу зрушыць з месца не ўдасца. Магу прывесці прыклад з турэцкага вопыту. За восем гадоў яны дабіліся таго, што ў дзяржаўным валоданні не засталося ніводнага грузавіка, — акрамя арміі. Напэўна, нам таксама трэба ісці па такому ж шляху прыватызацыі. Прыватны ўласнік не будзе ганяць парожні грузавік і марнаваць паліва.

Леанід БІРУКОЎ, былы камандзір партызанскай брыгады:

— Ужо шмат гадоў спрабую дабіцца таго, каб былі разгледжаны і прыняты мае прапановы па рэарганізацыі службы знешняй разведкі, КДБ і МУС.

— Леанід Паўлавіч, я чытаў Вашы дакументы. Напэўна, толькі Вы лічыце іх глыбока навуковымі. Не пераконвайце ўлады ўкараніць Ваш дакумент — пераканайце лепш спецыялістаў. Улада не будзе ўмешвацца ў вузка навуковыя праблемы.

Віктар КУЛЕШ (г. Ліда):

— Якія меры прадпрымаюць урад і Вярхоўны Савет па вяртанню даўгоў беларускім прадпрыемствам? Нашаму заводу «Оптык» Расія задаўжала 119 мільёнаў рублёў.

— Узаемазалік, шляхам якога мы ідзём і які з цяжкасцю «прабіваем», — усё ж дае сякія-такія вынікі. Але гэта не вельмі адпавядае прынцыпам рынкавай эканомікі і не надта спрыяе стабілізацыі фінансаў.

Думаю, узаемаразлік з Расіяй пакуль што будзе, а далей—рызыка за ўласны кошт. Не маеш грошай — не купляй, а праштрафіўся — банкрут.

Рыгор БЕЛЬЧАНКА, пенсіянер (г. Мінск):

— Ці будзе ў нас свая валюта, каб засцерагчы ўнутраны рынак?

— Напэўна, з цягам часу гэта давядзецца рабіць. Але ў цяперашнім стане, у якім знаходзіцца прамысловасць, мы не можам зрабіць нашу валюту стабільнай. У нас няма золата запасу, алмазнага фонду, каштоўных металаў. Акрамя таго, мы, на жаль, не вырабляем столькі якасных тавараў, каб забяспечыць стабільнасць валюты.

У такім стане патрэбны стабілізацыйны фонд, пазыка. Але мы на такія крэдыты таксама не можам пайсці, бо на нас вісяць даўгі былога Саюза. Таму не трэба спяшацца, каб яшчэ больш не пагоршыць сітуацыю.

— Якая, на Вашу думку, перспектыва ў нашай незалежнасці?

— Добрая.

— Ці не пагражае нам вяртанне ў мінулае?

— Мяркую, што не.

***

Пасля «Прамой лініі» С. Шушкевіч адказаў на шматлікія пісьмы, тэлеграмы, тэлефонныя званкі, што прыйшлі ў рэдакцыю напярэдадні. Вось некаторыя з іх.

М. ЗАСІНЕЦ, загадчык гарана (г. Гомель):

— Ці лічыце Вы правільным пры падборы кадраў звяртаць увагу найперш на нацыянальную свядомасць?

— Катэгарычна не згодны з гэтым. Вядома, нацыянальная свядомасць — гэта вельмі важна, але галоўнае — педагагічная падрыхтоўка, прафесіянальны ўзровень.

Увогуле, мы не павінны спяшацца, каб не скампраметаваць ідэю. Нам трэба не дапусціць супрацьпастаўлення прафесіянальных ведаў і нацыянальнай свядомасці.

Алесь САВІЦКІ (г. Слуцк):

— У час сустрэчы ўрадавай дэлегацыі Расіі і Беларусі, адказваючы на пытанне: ці можна лічыць дасягнутыя дагаворанасці «пачаткам канфедэрацыі» ў рамках СНД, Ягор Гайдар сказаў, што іх можна разглядаць крокам у гэтым напрамку. З такой трактоўкай чамусьці пагадзіўся і Кебіч. Што гэта — вяртанне да старых часоў?

— Я хачу сказаць наступнае. Што датычыцца палітычных пытанняў — іх вырашае Вярхоўны Савет, і ніякіх рэкамендацый па гэтаму пытанню нашаму ўраду не было дадзена. Гэта прыватная думка, яна не зафіксавана ні ў якіх дакументах. І я шкадую, што такое далучэнне да думкі суседа, — можа, нават добрага суседа, — адбылося. У палітычным сэнсе гэтага нельга было рабіць. Я, дарэчы, не валодаю дакладнай інфармацыяй аб гэтым. Вы ведаеце, што яна, бывае, скажаецца прэсай. Я магу пацвердзіць, што ніякі афіцыйны дакумент не ідзе далей тых пазіцый, якія зацверджаны ў пагадненнях аб Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Больш таго. Калі ўжо такое дапусціць, то гэта павінна прайсці ратыфікацыю Вярхоўным Саветам. Таму я думаю, што баяцца няма чаго. А калі будуць падставы для больш цеснай інтэграцыі, гэта можа быць вырашана праз рэферэндум.

Марыя ЦІКОЦКАЯ (г. Пінск):

— Чаму не склікалі сесію Вярхоўнага Савета, каб ратыфікаваць дагавор аб звычайных узброеных сілах у Еўропе? Беларусь аказалася, здаецца, адзінай дзяржавай НБСЕ, якая не выканала гэтага патрабавання...

— Цяпер ужо можна расказаць аб перадгісторыі гэтага пытання. Мы сапраўды былі ў цяжкім становішчы, таму што не маглі канструктыўным чынам ратыфікаваць гэтае пагадненне. Была пагроза, што мы акажамся адны сярод непадпісаўшых дагавор. І таму хацелі склікаць нечарговую сесію. Але ж наша дэмакратыя пайшла так далёка, што далей няма куды. Я папрасіў высветліць — ці можам мы склікаць сесію? І высветлілася, што найбольшая колькасць дэпутатаў, якую мы можам сабраць, — гэта 208—210 чалавек. Значыць, мы маглі апынуцца ў вельмі нязручным становішчы. Тады мы накіравалі нашых дыпламатаў у Вену, у Швецыю, звязаліся з пасольствам Нідэрландаў, зрабілі іншыя захады, каб знайсці нейкі спосаб паказаць, што мы выконваем пагадненне. Інакш глядзіце, што магло атрымацца. Мы склікаем сесію, але на ёй кворуму няма, а той, хто хоча дэстабілізаваць палітычнае становішча, галасуе супраць, і ратыфікацыя не праходзіць. Тады мы не змаглі б ад імя Прэзідыума Вярхоўнага Савета зрабіць заяву аб ратыфікацыі — а гэта ўжо быў бы ні з чым не параўнальны палітычны скандал. Таму я свядома запрасіў да сябе многіх паслоў і растлумачыў ім чэсна нашу сітуацыю. Гэта было сустрэта з разуменнем. І ні адзін з выступаўшых у Хельсінкі не папракнуў нас за гэта. Зараз мы маем магчымасць на працягу трох месяцаў ратыфікаваць пагадненне.

Анатоль ГУЛЕЦКІ (Мазырскі раён):

— Гісторыя 20-тых гадоў паказала, што для Беларусі найбольш прымальны сацыял-дэмакратычны шлях развіцця. Вядома, што і Вы, Станіслаў Станіслававіч, прытрымліваецеся такой думкі...

— Я адказаў бы так. Калі я знаёміўся з праграмай сацыял-дэмакратычнай партыі Германіі, то заўважыў, што ніводная дзяржава ў свеце не развівалася інтэнсіўна ў цяжкі перыяд свайго існавання на падставе сацыял-дэмакратычных ідэй. Я не ведаю такой гістарычнай практыкі. Але ні адна дзяржава не мела такой гісторыі, як дзяржавы былога Саюза. Я думаю, што мы павінны знайсці свой шлях. І мы яго шукаем.

Мікалай РАДЗІВАНОВІЧ (вёска Саланое, Жлобінскі раён).

— Вашы адносіны да рэферэндуму?

— Калі свята выконваць закон, то пытанне аб рэферэндуме можа вырашыць толькі чарговая сесія Вярхоўнага Савета. А чарговая — гэта не значыць, бліжэйшая. Таму будзем чакаць чарговай сесіі. Раней яны склікаліся два разы на год. Але мы яе збяром хутка, бо ў нас ёсць тэрміновыя пытанні. Ініцыятары рэферэндуму, шукаючы шляхоў да згоды, мусяць свята выконваць законы. Учора я чуў выступленне аднаго з ініцыятараў, які заявіў, што калі Вярхоўны Савет не ў стане вырашыць пытанне аб рэферэндуме, то павінен самараспусціцца. Калі стаць на гэты пункт гледжання, то 400 тысяч чалавек, няхай і вельмі сумленных, хочуць распусціць Вярхоўны Савет, абраны многімі мільёнамі выбаршчыкаў. Што — гэта сумленна? Ды і фармулёўка пытання, я ўжо не першы раз гэта кажу, вельмі мудрагелістая.

— Чытачы звяртаюць увагу, што голас каманд, калі можна так сказаць, Савета Міністраў, апазіцыі БНФ больш чуваць у прэсе, чым голас каманды Шушкевіча. Калі ён і адказвае сваім апанентам, дык неяк мякка, занадта інтэлігентна. Між тым, абвінавачванні ў Ваш адрас гучаць даволі сур'ёзныя — у здрадзе беларускаму народу, патаканні наменклатуры, былым партапаратчыкам...

— Скажыце, калі ласка, дык што мне — мітынгаваць ці справу рабіць? Есць тактычныя меркаванні, а ёсць стратэгічныя. Памятаеце, Зянон Пазьняк гаварыў, што я паехаў за мяжу, прынізіў беларускую годнасць і што Беларусь за мяжой ніхто не ведае. А мяне, маўляў, не трэба туды пускаць, бо я сустракаюся там з другаснымі асобамі... Дык што, я павінен быў выйсці на трыбуну і апраўдвацца? А ці справа гэта сур'ёзных людзей? Няхай сёння Пазьняк скажа, што Беларусь невядомая ў свеце і што вышэйшыя кіраўнікі вядучых дзяржаў ігнаруюць нас. Не я прасіўся да Буша на гутарку, а ён мяне запрасіў. І ЗША, і Англія, і Францыя нас паважаюць. Усё гэта стала на месца. А ўсё астатняе — размовы.

Вялі «Прамую лінію» і падрыхтавалі матэрыялы да друку Уладзімір АНДРЫЕВІЧ, Валянцін ЖДАНКО, Аляксандр КОКТЫШ, Міхаіл МІХАЕВІЧ, Людміла РЫЖАНКОВА.

Іншыя тэлефонныя званкі і пісьмы, якія паступілі напярэдадні і ў дзень правядзення «Прамой лініі», будуць выкарыстаны ў наступных дыялогах «Звязды» са Старшынёй Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіславам Шушкевічам, які даў згоду рэгулярна адказваць на пытанні чытачоў нашай газеты.

Радыё Факт

Сумна вядомы Чарнобыль парадзіў страшэнны сіндром страху перад новай катастрофай. Пацвярджэнне таму — здарэнне на Ігналінскай атамнай электрастанцыі ў Літве. «Радыёфакт» звязаўся са штабам грамадзянскай абароны Рэспублікі Беларусь. Сапраўды 20 ліпеня г. г. ў 15 гадзін 30 мінут на першым энергаблоку Ігналінскай атамнай электрастанцыі адбылася ўцечка кампанентаў азоту і гелію. У 16 гадзін 10 мінут няспраўнасць была ліквідавана. Аварыя па сваіх выніках, мяркуюць кампетэнтныя органы, небяспекі не ўяўляе.

***

Пры дапамозе нямецкага Чырвонага Крыжа ў Мінску будзе ўведзены цэнтр па перасадцы касцявога мозгу. Вопыт беларускім урачам будуць перадаваць калегі з Ганновера, якія добра асвоілі методыку перасадкі касцявога мозгу. Тэхніку для цэнтра стварае ў Мінску адно з мясцовых прадпрыемстваў, якое раней выпускала электроніку для ваенных мэт. Першыя тры гады нямецкі Чырвоны Крыж будзе бясплатна пастаўляць медыкаменты для гэтай клінікі, якую мяркуюць увесці ў строй у наступным годзе.

***

Спыніў работу рачны порт Гродна. У вымушаны адпачынак адпраўлены супрацоўнікі. Узровень вады ў Нёмане кожны дзень падае на тры сантыметры. Апошні раз з-за засухі Нёман быў несуднаходным 111 гадоў назад.

***

Беларусь робіць паўныя захады, каб стаць самай аўтамабільнай дзяржавай сярод дзяржаў — членаў СНД. Значным крокам на гэтым шляху будзе выстаўка «Мінскаўта-92». У экспазіцыі 50 машын лепшых вытворцаў аўтамабіляў з ЗША, Еўропы і Японіі. Нягледзячы на астранамічныя цэны, большасць машын у дні работы выстаўкі будзе набыта. Пра гэта «Радыёфакту» сказаў дырэктар сумеснага прадпрыемства «Сега «П+С» Генадзь Лажкоў.

***

Двухпакаёвая кватэра, зямельны ўчастак пад катэдж у межах Мінска наштуюць па мільёну рублёў. Металічны гараж—320 тысяч. А месца пад гараж—63 тысячы рублёў. Меншыя такія сумы былі прапанаваны пакупнікам, якія прынялі ўдзел у дабрачынным аўкцыёне, праведзеным выканкомам Фрунзенскага райсавета народных дэпутатаў беларускай сталіцы. Увесь прыбытак ад аўкцыёна пойдзе для малазабяспечаных жыхароў раёна.

***

Дзіўную аперацыю з закупкай мяса, правёў Магілёўскі аблспажыўсаюз. Для Бабруйскага камбіната каператыўнай прамысловасці мяса было закуплена ажно ў Краснадарскім краі. І гэта ў той час, калі мясцовыя мясакамбінаты забіты прадуктам, а калгасы і саўгасы вобласці не могуць рэалізаваць жывёлу. Вось такі парадокс.

У ПРАКУРАТУРЫ ГРОДЗЕНСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Суверэнітэт дэкларавацы і рэальны

Напярэдадні Дня незалежнасці Станіслаў Станіслававіч ШУШКЕВІЧ даў абшырнае інтэрв'ю Беларускаму інфармацыйнаму агенцтву і нацыянальнаму тэлебачанню, якое друкуюць сёння іншыя рэспубліканскія газеты.

Многія з адказаў старшыні парламента пераклікаюцца з дыялогамі, якія ён вёў у час «прамой лініі» з чытачамі «Звязды», таму наша газета абмяжоўваецца кароткім пераказам тых тэзісаў, пра якія не згадвалася ў «прамой лініі».

Этапам барацьбы за ўладу назваў С. Шушкевіч імкненне пэўных палітычных сіл шляхам рэферэндуму дабіцца датэрміновага роспуску Вярхоўнага Савета. На думку старшыні парламента, цяперашні Вярхоўны Савет «здольны зрабіць больш і хутчэй, чым новы». Адначасова С. Шушкевіч акцэнтаваў увагу на апошніх сацыялагічных даследаваннях, якія паказалі, што не падтрымліваюць вярхоўную ўладу толькі 30 працэнтаў насельніцтва рэспублікі. Большасць жа ставяцца да дзейнасці Вярхоўнага Савета і ўрада з адабрэннем.

Шмат месца ў інтэрв'ю адведзена эканамічным праблемам. С. Шушкевіч выказаўся за ўласны беларускі шлях эканамічных пераўтварэнняў, які б адрозніваўся ад стратэгіі рэформ суседзяў сваёй памяркоўнасцю. Перараз меркаванне ўласнасці, на думку лідэра краіны, трэба пачынаць з прыватызацыі гандлю і сферы паслуг.

Асобна С. Шушкевіч спыніўся на тым, ці павінна Беларусь у рэфармаванні эканомікі ісці ўслед за Расіяй:

— Я не магу даць такіх гарантый, якія дае Прэзідэнт Расіі. Ён у значнай ступені абапіраецца на знешнеэканамічныя фактары, на крэдытаванне вонкавае. Мы не можам пайсці па гэтаму шляху, не можам павялічваць дзяржаўны доўг, таму што цяпер, па ацэнках нашых эканамістаў, мы перайшлі ўжо крытычную мяжу. Мы павінны ісці не па шляху крэдытавання, а па шляху стварэння ўмоў для замежных інвестыцый.

Алтымістычна ацаніў С. Шушкевіч цяперашнюю эканамічную сітуацыю, заявіўшы, што яна стабілізуецца і ёсць шанцы на яе паляпшэнне. Праўда, «засуха крыху сапсавала нам настрой: Мы чакалі, што ўраджай сёлета будзе рэкордны. Зараз бачым, што збожжа намалоцім менш, чым разлічвалі. Мяркую, што ўсё ў парадку будзе з бульбай».

У перадсвяточным інтэрв'ю было шмат пытанняў аб суверэнітэце, шляхах будаўніцтва незалежнай дзяржавы, інстытутах дзяржаўнасці. Ці справядліве сцвярджэнне, што суверэннасць звалілася на нас нечакана і дагэтуль з'яўляецца нязвыклай цяжкай ношай? Аспрэчваючы гэту думку, Станіслаў Шушкевіч зазначыў:

— Наша суверэннасць выпакутаваная, заслужаная нашым народам, волю якога выказаў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь. Другая справа, што яна патрабуе вельмі высокай кваліфікацыі ад кіраўнікоў. На жаль, за нашу папярэднюю гісторыю, і не толькі савецкую, дарэчы, гіпертрафіраваныя формы набылі ўтрыманства. Заўсёды быў нейкі начальнік, які даваў парады, як і што рабіць. А цяпер такога начальніка няма. Таму і цяжка.

Думка аб тым, што ў вырашэнні любых праблем, — ад прыватных да дзяржаўных, палітычных— павінен захоўвацца адзіны законны падыход, даміную ў адказах Старшыні Вярхоўнага Савета на большасць пастаўленых журналістамі пытанняў, лішні раз пацвярджаючы крэда С. Шушкевіча, — кіравацца не суб'ектыўнымі меркаваннямі і сімпатыямі, а духам і літарай закона.

Падрыхтаваў Валянцін ЖДАНКО.

Стан сельгаскультур не палепшыцца

Каторы ўжо дзень стаіць невыносная спякота. Нават пад дахам і ў цяні даймае. А на палях і агародах сонца смаліць так, што ўсё заўчасна сохне і да пары даспявае. Тыя дажджы, што прайшлі толькі ў некаторых раёнах рэспублікі ў ноч з 23 на 24 ліпеня, асаблівай палёгкі не прынеслі. У большасці месц ападкі склалі ўсяго ад 1 да 8 мм. Толькі ў Пружанах — 10 мм.

Абследаванні, праведзеныя гідраметэаслужбай рэспублікі, пацвердзілі меркаванні аб далейшым пагаршэнні стану сельскагаспадарчых культур. На працягу ўсяго ліпеня ішлі толькі кароткачасовыя дажджы і размяркоўваліся на тэрыторыі вельмі нераўнамерна.

— За ўвесь летні перыяд, — падкрэсліла інжынер-аграметэаролаг Гідраметцэнтра Зоя Лучанінава, — амаль паўсюдна на тэрыторыі рэспублікі назіраўся недабор ападкаў. У ліпені на большай частцы іх выпала толькі 15—40 працэнтаў ад нормы. Таму забяспечанасць пасеваў вільгаццю недастатковая, назіраецца далейшае пагаршэнне іх стану. Заўчасна засыхае лісце ў збожжавых, а ў яравых на ўзвышаных участках і лёгкай глебе месцамі нават засыхаюць сцяблы і каласы. Неспрыяльныя ўмовы для бульбы. Тэмпература глебы на глыбіні 10 сантыметраў у асобныя дні даходзіць да 24—26 градусаў, што вельмі неспрыяльна для фарміравання і росту клубняў. Асноўныя масівы азімых і большая частка яравых знаходзяцца ў фазе васковай спеласці. Месцамі яны перайшлі ўжо ў фазу поўнай спеласці. Але ўраджай іх чакаецца ніжэйшым, чым меркавалі. Найгоршы стан гэтых культур у заходняй частцы Віцебскай вобласці. Добрых умоў для іх росту і паспявання не было сёлета на Беларусі нідзе.

На жаль, суцяшальнага прагнозу на бліжэйшыя дні сіноптыкі не абяцаюць. Калі і пойдуць дажджы, то яны будуць кароткачасовыя і навальнічныя. А потым зноў суха і горача.

Марыя ДАБЖЫНСКАЯ.

Мечыслаў Іванавіч Гіруць — чалавек на Гродзеншчыне вядомы. Як-ніяк, першы намеснік старшыні аблвыканкома, узначальвае абласны камітэт па сельскай гаспадарцы і прадуктах харчавання. Таму сам факт разгляду некаторых яго ўчынкаў ажно на дзвюх апошніх сесіях абласнога Савета — падзея, згадзіцеся, неардынарная. Чым жа «вызначыўся» гэты кіруючы работнік?

Каб высветліць ісціну, у пракуратуры Гродзенскай вобласці атрымалі тлумачэнні 80 службовых асоб плюс апыталі яшчэ 29 чалавек. 48 розных эпізодаў сталі прадметам праверкі.

Днямі пракуратура накіравала ў абласны Савет народных дэпутатаў інфармацыйную запіску, са зместам якой камісія па прывілеях і льготах вырашыла пазнаёміць чытачоў «Звязды».

КАТЭДЖ ДЛЯ СЫНА

Як сёння няпроста пабудаваць — вядома кожнаму. А вось М. Гіруць свайму сыну Сяргею стварыў рэжым найбольшага спрыяння. У арбіту будаўніцтва катэджа ў вёсцы Баранавічы Гродзенскага раёна аказаліся ўцягнутымі 9 калгасаў, 5 райаграпрамтэхнік, 8 аб'яднанняў і прадпрыемстваў, 2 каапаратывы. Каб дагадзіць кіраўніку сельскагаспадарчай вытворчасці вобласці, службовыя асобы заніжалі кошт будматэрыялаў і выкананых работ, а найбольш прыбліжаныя асабіста займаліся пытаннямі будаўніцтва.

С. Гіруць прадставіў у пракуратуру дакументы па аплаце за выкананыя работы і будматэрыялы на агульную суму 46 тысяч рублёў. Аднак ён не змог растлумачыць, якім чынам заключаліся дагаворы з падрадчыкамі арганізацыямі, як набываліся матэрыялы ці заказваліся работы. Ён не ведае назваў і месцазнаходжання гэтых прадпрыемстваў і арганізацый, прозвішчаў службовых асоб, з якімі меў справу. Як дастаўляліся гатовая прадукцыя і матэрыялы на будоўлю, С. Гіруць таксама не мае ўяўлення. Ды і навошта было пра гэта клапаціцца?..

Дарэчы, у адпаведнасці з генеральным планам забудовы мікрараёна «Баранавічы», зямельныя ўчасткі №№ 260—275 і 360—372 былі зарэзерваваны за калгасам «Ленінскі шлях» Гродзенскага раёна для забеспячэння жыллём работнікаў гэтай гаспадаркі. Аднак былы старшыня калгаса (цяпер адказны работнік аблсельгасхарча) Т. Нартовіч аддаў перавагу высокапастаўленым службовым асобам і іх сваякам. У ліку апошніх аказаўся і сын першага намесніка старшыні аблвыканкома. А ўвогуле з 22 забудоўшчыкаў толькі пяцёра маюць дачыненне да калгаса. Усе астатнія атрымалі ўчасткі дзякуючы асабістым кантактам з Т. Нартовічам. Сярод гэтых шчасліўчыкаў —начальнік сектара аблсельгасхарча С. Чарняк, сын намесніка старшыні аблагразабеспячэння В. Працкайла, намеснік кіраўніка будаўніча-мантажнага трэста № 30 В. Вярышка, намеснік дырэктара Гродзенскага камбіната будаўнічых матэрыялаў І. Кузняцоў, галоўны інжынер Гродзенскай аўтабазы сувязі А. Коўшык...

КАМУ НА БЕЛАРУСІ ЖЫЦЬ ДОБРА?

9 калгасаў, 5 райаграпрамтэхнік, 8 аб'яднанняў і прадпрыемстваў, 2 каапаратывы аказаліся ўцягнутымі ў арбіту будаўніцтва аднаго з катэджаў у вёсцы Баранавічы Гродзенскага раёна

Характэрна, што ўсе забудоўшчыкі ў мікрараёне «Баранавічы» напісалі заявы, што пасля завяршэння будаўніцтва здадуць дзяржаўныя кватэры мясцовым Саветам для размеркавання іх сярод чаргавікоў. Аднак потым робіцца «ход канём». Выкарыстоўваючы недасканаласць заканадаўства, кватэры выкупляюцца.

Што датычыць С. Гіруця, дык у чэргах на паляпшэнне жыллёвых умоў і атрыманне зямельнага ўчастка пад індывідуальнае будаўніцтва яго прозвішча не значылася. І тым не менш ён лёгка абышоў не адну сотню чаргавікоў. Да таго ж, кватэра, у якой ён пражывае разам з жонкай і бацькамі, пасля ўводу катэджа вызвалена не будзе, паколькі яна выкуплена і стала ўласнасцю М. Гіруця.

А цяпер некаторыя падрабязнасці аб будоўлі ў Баранавічах (плошча 221,28 кв. метра, плошча цокальнага паверха, дзе размешчаны більярдная, пакой для спартыўных заняткаў, майстэрня, гараж і кладоўкі — 108,93 кв. метра). Дом абсталяваны водаправодам, вентыляцыяй, электраасвятленнем, радыёфікаваны, да яго падведзены газ, ацяпленне і гарачая вада.

Напрыклад, у гаспадарцы «Гейсішкес» Вільнюскага раёна С. Гіруць набывае 27.272 штукі цэглы. Цікава, на якой падставе? Аказваецца, ён дапамог атрымаць літоўцам у калгасе «Маяк» Ашмянскага раёна 23,5 тоны насення жыта, кукурузы і грэчкі. Хто ж у «Маяку» старшынёй? І. Гіруць— родны брат першага намесніка старшыні аблвыканкома.

А вось дырэктар Шчучынскай райаграпрамтэхнікі С. Карповіч узяў на сябе клопаты аб забеспячэнні катэджа Гіруця-малодшага цяплом. Выпісваюцца фіктыўныя дакументы, у адпаведнасці з якімі пяцісекцыйны чыгунны кацёл быццам бы накіроўваецца ў калгас «Чырвоны сцяг» Шчучынскага раёна. Аднак туды не трапіў, а апынуўся на «будоўлі веку» ў Баранавічах.

Потым спатрэбіўся яшчэ адзін кацёл. Да справы падключаецца кіраўнік Аульскага міжраённага аб'яднання па вытворчатэхнічнаму забеспячэнню сельскай гаспадаркі Л. Звярко. Жадаючы дагадзіць М. Гіруцю, ён спецыяльна пасылае машыну ў Каўнас. Аднак у першы дзень нешта не атрымалася. Аўтамабіль вяртаецца назад, а назаўтра зноў накіроўваецца па таму ж маршруту. На гэты раз — удала.

Спрытна правярнулі справу і з радыятарамі, якія паступілі з завода ацяпляльнага абсталявання ў адрас аб'яднання «Аграпрамэнерга». Дарэчы, яно абслугоўвае 17 раёнаў вобласці, і гэта было першае за год фондавае паступленне радыятараў. Іх катастрафічна не хапала на будаўніцтве многіх вытворчых і сацыяльных аб'ектаў вобласці. Аднак старшыня аблсельгасхарча палічыў неабходным забяспечыць фондавымі радыятарамі ў першую чаргу катэдж свайго сына. Па яго ўказанню старшыня аб'яднання А. Казакевіч накіраваў на гэты аб'ект надзвычайнай важнасці большую палавіну таго, што атрымалі на ўсю вобласць. Добра яшчэ, што астатнія радыятары былі своечасова накіраваны на вытворчыя патрэбы, паколькі потым і іх М. Гіруць спрабаваў забраць. Не атрымалася. Але не бяда, фондавымі радыятарамі з С. Гіруцем падзяліўся і кіраўнік Дзятлаўскай райаграпрамтэхнікі Л. Кашко.

Гэтак жа проста атрымліваў забудоўшчык на розных прадпрыемствах піламатэрыялы, цэглу, шыфер, цэмент, сілікатныя блокі.

У праект водазабеспячэння насельніцтва вёскі Баранавічы, заказчыкам якога выступіў калгас «Ленінскі шлях», па просьбе М. Гіруця (а фактыч

Barcelona'92

Алімпіяда бярэ старт

Знаёмцеся: пасланцы Беларусі

Зборная каманда СНД прадстаўлена ў Барселоне 497 спартсменамі. Сярод іх 55 беларускіх атлетаў, якія выступяць у 18 відах алімпійскай праграмы. Вось іх імёны:

Баскетбол: Ірына СУМНІКАВА (1964 года нараджэння) і Алена ШВАЙБОВІЧ (1965) — абедзве з Мінска.

Гандбол: Андрэй БАРБАШЫНСКІ (1970), Андрэй МІНЕУСКІ (1969) і Міхаіл ЯКІМОВІЧ (1967) — усе з Мінска.

Вольная барацьба: Вугар АРУДЖАЎ (1971) і Сяргей СМАЛЬ (1968) — абодва з Гомеля.

Грэка-рымская барацьба: Сяргей ДЗЕМЯШКЕВІЧ (1966) — Мінск.

Веласпорт: Ігар ПАСТУХОВІЧ (1966) — Мінск, Ігар ПАТЗНКА (1969) — Бабруйск, Зінаіда СТАГУРСКАЯ (1971) — Віцебск.

Спартыўная гімнастыка: Святлана БАГІНСКАЯ (1973) і Віталь ШЧЭРБА (1972) абодва з Мінска.

Веславанне акадэмічнае: Ігар БАРТНІЦКІ (1964) і Наталля СТАСЮК (1969) — абодва з Гомеля, Валерый БЕЛАДЗЕДАЎ (1971) — Мінская вобласць, Сяргей КІНЯКІН (1961), Уладзімір РАМАНІШЫН (1959), Пётр ПЯТРЫНІЧ (1957), Ірына ГРЫБКО (1969), Марына ЗНАК (1961), Марына СУПРУН (1962), Алена ХЛОПЦАВА (1960), Кацярына ХАДАТОВІЧ (1972), Дзмітрый НОС (1970), Анатоль КОРБУТ (1973) — усе з Мінска.

Ветразевы спорт: Алена ПАХОЛЬЧЫК (1964) — Мінск, Віктар БУДАНЦАЎ (1961) і Сяргей КРАУЦОЎ (1960) — абодва з Мінскай вобласці.

Лёгкая атлетыка: Таццяна ЛЕДАУСКАЯ (1966), Наталля ШЫКОЛЕНКА (1964) — абедзве з Мінска, Анжэла АТРОШЧАНКА (1970), Ірына ЯТЧАНКА (1965) — абедзве з Гомеля, Анатоль МАКАРЭВІЧ (1970), Азат РАКІПАЎ (1968) — абодва з Мінскай вобласці, Ігар АСТАПКОВІЧ (1963), Эдуард ХЯМЯЛЯЙНЕН (1969) — абодва з Гродна, Аляксандр ПАТАШОЎ (1962) — Віцебск, Мадзіна БІКТАГІРАВА (1964) — Мінск-Брэст, Ларыса КАРАТКЕВІЧ (1967) — Віцебск — Мінск.

Плаванне: Алена РУДКОЎСКАЯ (1973) — Гомель.

Сучаснае пяцібор'е: Андрэй СМІРНОЎ (1967) — Гомель.

Кулявая стральба: Андрэй ВАСІЛЬЕЎ (1967) — Брэст, Ірына ШЫЛАВА (1960) і Канстанцін ЛУКАШЫК (1975) — абодва з Гродна.

Цяжкая атлетыка: Аляксандр КУРЛОВІЧ (1961) — Гродна, Леанід ТАРАНЕНКА (1956) — Мінск.

Тэніс: Наталля ЗВЕРАВА (1971) — Мінск.

Конны спорт: Міхаіл РЫБАК (1963) — Мінская вобласць.

Хакей на траве: Сяргей МАХОТКІН (1965) і Віталь ХАЛОПАЎ (1959) — абодва з Мінска.

Веславанне на байдарках і каноэ: Дзмітрый ДАУГАЛЕНАК (1971), Сяргей КАЛЕСНІК (1970) — абодва з Мінска, Аляксандр ГРАМОВІЧ (1969) — Мазыр, Аляксандр МАСЕЙКАЎ (1971) — Магілёў.

...І «сам» старшыня

У ліку прадстаўнікоў на Алімпіядзе не толькі спартсмены, а і кіраўнікі спорту, спецыялісты, трэнеры, суддзі...

Так, у саставе кіраўніцтва ўсёй аб'яднанай каманды СНД уваходзіць «сам» старшыня Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па фізічнай культуры і спорту Уладзімір Рыжанкоў.

Зборную Садружнасці па ручному мячу сярод мужчын выведзе на пляцоўку не галоўны трэнер, настаўнік мінскага СКА Спартак Мірановіч.

Сярод арбітраў, якія будуць абслугоўваць спаборніцтвы па сінхроннаму плаванню, суддзя міжнароднай катэгорыі начальнік аднаго з аддзелаў Дзяржкамспорту Беларусі Пётр Міхеенка.

Надзеі рэспублікі

Гэтыя імёны вядомыя ўсяму свету. Менавіта на іх грамадскасць і аматары спорту Рэспублікі Беларусь усклаваюць вялікія надзеі на спаборніцтвах у алімпійскай Барселоне. Праўда, ніхто не будзе супраць, калі да гэтай выдатнай чацвёркі дабавіцца хто-небудзь (чым больш, тым лепш) і яшчэ са спісу нашых пасланцаў у далёкай таямнічай Каталоніі.

На здымках:

● мінская тэнісістка Наталля Зверава нядаўна зноў выйграла Уімблдонскі турнір. А гэта, між іншым, — неафіцыйнае сусветнае першынство! Каментары, як кажуць, не патрэбны;

● 20-гадовы гімнаст Віталь Шчэрба з Мінска — у зеніце таленту і прызнання. Толькі за апошнія два гады ён стаў пераможцам першынстваў Еўропы і свету. Дай Бог, каб і выступленне ў Барселоне стала для яго трыумфам.

● чэмпіёнка і сярэбраны прызёр XXIV Алімпіяды, чэмпіёнка свету Таццяна Ледаўская з Мінска, мяркуючы па перадалімпійскіх стартах, гатова паўтарыць свае поспехі чатырохгадовай даўнасці;

● алімпійскі чэмпіён Сеула, неаднаразовы чэмпіён і рэкардсмен свету і Еўропы штангіст з Гродна Аляксандр Курловіч;

Фота Уладзіміра ІВАНОВА.

Маэстра зрабіў ручкай

Васемнаццаць гадоў (цэлую спартыўную эпоху!) ён быў лідэрам не толькі зборнай былога Саюза ССР, а і прызнаным маэстра сусветнага фехтавання. Пяць перамог на чэмпіянатах свету ў асабістых паядынках і столькі ж — пяць — у саставе каманды краіны, «золата», «серабро» і «бронза» Алімпійскіх гульняў 1976-га, 1980-га і 1988 гадоў... Унікальная калекцыя! І ўсё гэта на рахунку аднаго і таго ж чалавека — мінскага рапірыста Аляксандра Раманькова.

Чатыры гады назад у алімпійскім Сеуле зборная Савецкага Саюза, якую Саша вяводзіў на фехтавальную сцяжынку, зрабіла неверагоднае: упэўнена выйграла камандны турнір рапірыстаў, хоць лічылася ў той час далёка не мацнейшай. Тады капітан зборнай і атрымаў самую дарагую ў сваім спартыўным жыцці ўзнагароду.

...Тады яму было 35. Узрост, вядома ж, сталы, як кажуць, для спорту — крытычны. Аднак акрылены перамогай, Раманькоў разлічваў «пражыць» у сусветным фехтаванні яшчэ адзін алімпійскі цыкл, гэта значыць, «дацягнуць» да Алімпіяды-92. Прыклад жа спартыўнага даўгалецця перад ім быў яркі і выразны: старэйшы таварыш Аляксандра неаднаразовы чэмпіён Алімпійскіх гульняў і свету мінскі шабліст Віктар Сідзяк апошні раз выступіў на Гульнях ледзь не ў сорак! Але...

Яшчэ летась Раманькоў выступаў у радах зборнай, удзельнічаў і ў першынстве краіны, і ў сусветным чэмпіянаце. Трымаўся, трэба сказаць, малайцом. А вось сёлета Саша знік са спартыўнага небасхілу. Што ж здарылася? Адзін з трэнераў мужчынскай зборнай Садружнасці Незалежных Дзяржаў па фехтаванню на рапірах Марк Мідлер літаральна за некалькі дзён да ад'езду ў Барселону сказаў журналістам:

— Ветэран вырашыў не выпрабоўваць лёс і нядаўна пачаў па кантракту працаваць у Паўднёвай Карэі. Не ведаю, ці ёсць прамая сувязь паміж пачаткам трэнерскай кар'еры Раманькова і тым, што ў гэтым сезоне паўднёвакарэйскія рапірысты прыкметна прыбавілі ў майстэрстве...

Вось такія, як кажуць, пірагі. Такім чынам, упершыню за апошнія 40 гадоў (!) на Алімпійскіх гульнях зборная краіны выступіць без прадстаўнікоў нашай рэспублікі. Крыўдна і балюча, што і казаць! Застаецца толькі нагадаць чытачам, што, акрамя Аляксандра Раманькова, на галоўных спаборніцтвах свету выступалі: Аляксандр Аўсянкін, Арнольд Чарнушэвіч, Юрый Дэксбах, Герман Бокун, Таццяна Самусенка, Аляксандр Паўлоўскі, Юрый Смалякоў, Аляксей Ніканчыкаў, Алена Бялова, Віктар Сідзяк, Мікалай Алёхін. Сапраўднае сузор'е «зорак» спорту!

Камандар— не камандарм

Да самага апошняга моманту лічыўся кандыдатам у алімпійскую зборную СНД вядомы ў спартыўным свеце барэц, чэмпіён Алімпійскіх гульняў 1988 года ў Сеуле мінчанін Камандар Маджыдаў. Але набраў Камандар два кілаграмы «лішняй» вагі (так, няпроста, а, мабыць, і проста немагчыма трымацца атлету ў рамках «сваёй» вагі) і быў вымушаны перайсці ў наступную катэгорыю — да 68 кілаграмаў. А там — новыя саперкі і канкурэнты. Літаральна за некалькі дзён да ад'езду зборнай Садружнасці на Гульні ў Барселону трэнерскі савет наладзіў Маджыдаву апошнюю праверку — паядынак за права стаць першым нумарам каманды з двухразовым чэмпіёнам свету Ісламам Дугучыевым з Растова. Гэта быў сапраўдны бой роўных. Але за дзесяць секунд (!) да заканчэння яго наш атлет прапусціў зусім нязначную і непрыкметную атаку Дугучыева... І развітаўся з формай паўнапраўнага ўдзельніка другой у сваім жыцці Алімпіяды.

А мог быць скандал і ў Барселоне...

Чатыры гады — з моманту папярэдняй Алімпіяды ў Сеуле — спартыўны свет жыў пад уражаннем дыскваліфікацыі за прымяненне допінгу славутага канадскага спрынтэра Бена Джонсана. Хто і якімі толькі словамі не лаялі яго! Адбыўшы пакаранне, Бен вярнуўся на бегавую сцяжыну, але быў гэта ўжо не той Джонсан...

Допінгавыя анаболікі — і сёння гэта не сакрэт — загубілі не адну таленавітую душу. Хто-ніхто са спартсменаў паспеў нават, дзякуючы ім, стаць і вялікім, і агульнапрызнаным. Але рана ці позна ўсё становіцца явай...

Доўгі час пад уражаннем ідэалагізацыі спорту мы не хацелі «бачыць», а, значыць, і не прызнавалі, што хімічныя і сінтэтычныя анаболікі прымянялі і прымяняюць да сённяшняга дня і нашы спартсмены. Праўда, апошнім часам пра гэта актыўна загаварылі — і найперш былыя славутасці спорту... А незадоўга да цяперашняй Алімпіяды, як кажуць, на свет божы, усплылі факты, што маюць дачыненне і да беларускіх спартсменаў.

Чэмпіянат Садружнасці Незалежных Дзяржаў, які даваў пуцёўкі ў алімпійскую Барселону, у кіданні дыску пераканаўча выйграла 28-гадовая мінчанка Эліна Зверава. Радавацца б ды і толькі, але... Допінг-тэст на прымяненне забароненых сродкаў, узяты потым у спартсменкі, паказаў станоўчы вынік. І вось — расплата: жорсткая, але справядлівая — Эліна пазбаўлена права выступаць на Гульнях XXV Алімпіяды. Як кажуць, слава Богу, што другое месца на тым чэмпіянаце заняла таксама прадстаўніца Беларусі Ірына Ятчанка і пуцёўка ў Барселону аўтаматычна перайшла да яе.

Што ж, на памылках (толькі ці памылка гэта?) вучацца. Няхай гэты выпадак стане ўрокам для ўсіх без выключэння спартсменаў — як масцітых, вопытных і тытулаваных, так і маладых, пачынаючых, тых, хто робіць толькі самыя першыя крокі ў вялікім спорце. Толькі вось ніяк не хочацца ўяўляць, што на такім вось допінг-кантролі магла быць злоўленай спартсменка там, у Барселоне... Быў бы скандал? Быў бы! Але ж і сораму б усім хапіла...

«СЛОНІМСКАЯ РАНІЦА»

Фальклорны ансамбль «Раніца» народнага прадпрыемства «Альберцін» з г. Слоніма (былы кардонна-папяровы завод) чацвёрты год радуе сваімі выступленнямі жыхароў раёна і вобласці. А нядаўна гэты калектыў быў госцем Беларускага тэлебачання, дзе ўдзельнічаў у перадачы «Запрашаем на вячоркі».

Мастацкі кіраўнік Галіна Мікалаеўна Адамовіч на базе мясцовага фальклору падрыхтавала праграму «Беларускія заручыны» — музычны абрад сватання.

Фота Анатоля ДРАЗДОВА.

25 ліпеня

Сёння ўдзень па рэспубліцы пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ў Гродна, Віцебску 23—25, Магілёве, Мінску, Гомелі — 24—26, Брэсце — 25—27 градусаў цяпла.

НА ДВОР'Е

У наступныя двое сутак пераважна без ападкаў, толькі ўдзень 27 ліпеня месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ўначы 12—17, удзень — 23—28 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ, інжынер-сіноптык.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту У. СЫЧОВА.

ДРУГІ КВАРТАЛЬНЫ КОНКУРС РАШЭННЯЎ

Аб'яўляем другі квартальны конкурс рашэнняў. Будзе прапанавана 10 заданняў — дзве двухходаўкі, дзве трохходаўкі, дзве шматходаўкі, два этюды, задачы на кааператыўны мат і адваротны мат.

За выяўленыя дэфекты ў кампазіцыях будуць налічвацца дадатковыя ачкі. Пераможца, які набярэ найбольшую колькасць ачкоў, атрымае прыз. Тэрмін прысылкі адказаў на задачы — два тыдні і тры тыдні — на этюды.

У пісьмах або паштоўках абавязкова ўказвайце імя і імя па бацьку, паштовы індэкс, адрас. На канверце павінна быць пометка «Шахматы». Вашы рашэнні трэба высылаць на адрас рэдакцыі: 220041, г. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыі газеты «Звязда».

Заданне № 1.

М. Бельчыкаў (Барысаў)
М. Храмцэвіч (Бабруйск)

Белыя: Крa1, Фd3, Лc2, Сe8, Сh8, Кc5, Кc6, п. d4 (8).

Чорныя: Крd5, Лb7, Лg6, Сh3, Кd1, Кf8, пп: a4, b5, e3, e6, f5 (11).

Мат за 2 хады.

Заданне № 2.

М. Бельчыкаў (Барысаў).

Белыя: Крh3, Фe2, Лd1, Лf8, Сa2, Сg5, Кb5, Кd4, пп: c5, f4, h5 (11).

Чорныя: Крe4, Фc1, Лf6, Лh6, Сb1, Сd8, Кe3, Кh4, п. f5 (9).

Мат за 2 хады.

ЗВЕРЦЕ РАШЭННІ

Кампазіцыі, апублікаваныя ў нумарах газеты за 20 мая і за чэрвень г. т., развязваюцца наступным чынам:

М. Плотнікаў. 1. Фb6 Лa3 2. Кd4 Сa5 3. Фb5 Лc3×.

Ю. Бережны. а) дыяграма б) бліэня Кc8 паставіць на d8.

а) 1. Фa3 С:c2 2. Фd3 fg+ 3. Крe4 Кd6×

б) 1. Фa1 Сg7 2. Фf6 fe +3. Крe5 Кf7×.

М. Бантыш. 1. Фc6 Сd4 2. Лd6+ Крd3 3. Крd5 Кf4×.

1. Лg5 Крf3 2. Крf5 Сd4 3. Фe6 Кh4×.

1. Лe5+ Крf3 2. Крf5 Сd6 3. Фe6 Кh4×.

В. Быкаў. На дыяграме чорны конь не на b5, а на b4.

1. Кd3 Лc4 2. К:f2 Л:c3 3. Кh3 Лc2 4. Кg1 Кg3×.

1. Сc7 Лa6 2. Кd3 Л:d6 3. К:f2 Лg6 4. Сh2 К:f2×.

У. Клюкін. 1. g7 Фa8 2. c8Ф+ Кр:c8 3. g8Ф Крb7 4. Кd6+ Кр:a7 5. Кb5+ Крb7 6. Фg2+ Крb8 7. Фg3+ Крb7 8. Фf3+! Крb8 9. Фf4+ Крb7 10. Фe4+ Крb8 11. Фe5+ Крb7 12. Фd5+ Крb8 13. Фd8+ Крb7 14. Кd6+ Крa7 15. Ф:a5+ Крb8 16. Фb6+ і 17. Ф:b7×.

М. Гарыслаўскі. 1. b3! ~ 2. bc4+ С:c4× 1... Кc4 ~ 2. Фg5+. 1... Кd2 2. Фe4+. 1... Кe3 2. Фf5+. 1... Кe5 2. Фd2+. 1... Кd6 2. c4+.

У. Іваноў. 1. Фh8! 1. Ф:g3? Сh4! 1. Фh6? Сf6!

У. Іваноў. 1. c3! 1. Фa4? Кр:d2 1. c4? Ke2!

ВЫНІКІ КОНКУРСУ

Падведзены вынікі першага квартальнага конкурсу рашэнняў. Было прапанавана 12 заданняў рознай ступені цяжкасці. Пастаянныя ўдзельнікі конкурсу добра рашалі задачы, але страцілі ачкі пры рашэнні этюдаў.

Паспяхова справіўся з заданнямі конкурсу Мікалай Губчык (Слуцкі раён), які набраў 42 ачкі. Па 36 ачкоў набралі К. Жук (Мінскі раён) і В. Быкаў (Мінск). Яны адзначаюцца кнігамі.

В. Лашманаў (Мінск) і Ул. Сакалоў (Гомель) набралі 35 ачкоў. Астатнія ўдзельнікі набралі менш за 30 ачкоў.

ГРОШЫ—НА БОЧКУ

ШТО ТАКОЕ РЭКЕТ У НАШЫМ РАЗУМЕННІ

Слова «рэкет» апошнім часам трывала ўвайшло ў наш ужытак, хоць многія невыразна ўяўляюць яго значэнне. Шукаць гэтае выяўленне ў Крымінальным кодэксе, для якога яно, здавалася б, роднае — даремна. Яго там няма. Звернемся да Савецкага энцыклапедычнага слоўніка, выдадзенага ў 1987 годзе. На старонцы 1.154 чытаем: «рэкет» — у ЗША — буйны шантаж, вымаганне, якое ажыццяўляецца шляхам пагрозы і насілля гангстэрамі (рэкеціранмі)».

Вось такі рэкет, аказваецца, ёсць толькі ў іх, у Штатах. Быў бы слоўнік 40-гадовай даўнасці, тады зразумела: «генетыка» і «кібернетыка» — ілжэнавукі і прадажныя дзеўкі капіталізму; арганізаваная злачынасць, прастытуцыя, рэкет — характэрныя рысы далёкага нам грамадства. Мы ж хутка развітаемся з апошнім злачынцам і будзем жыць у светлым камуністычным царстве, — як яшчэ не так даўно вяшчалі ідэалагічныя пастулаты. Гісторыя распарадзілася інакш: злачынасць непамерна ўзрасла, а камунізм так і застаўся «прывідам». Але «рэкет», паводле вызначэння сучасных слоўнікаў, па-ранейшаму не наша з'ява.

Тым не менш рэкет, на жаль, заўсёды быў у нас. Вазьміце стаўшыя класічнымі апавяданні І. Бабеля.

«Масье Эйхбаум, пакладзіце, прашу вас, заўтра раніцай пад вароты на Сафіеўскую, 17 — дваццаць тысяч рублёў. Калі вы гэтага не зробіце, дык вас чакае такое, што гэта нечувана, і ўся Адэса будзе пра вас гаварыць. З павагай Беня Кароль».

Тры пісьмы засталіся без адказу. Тады Беня прыняў меры. Яны прыйшлі ўначы — дзевяць чалавек з доўгімі палкамі ў руках...

Аднак вернемся да Крымінальнага кодэкса. Састаў злачынства, пад якім падразумяваецца «рэкет», гучыць там больш празаічна — «вымаганне» (стар. 145). Тым не менш, ад таго, як называюцца гэтыя дзеянні, нічога ў прынцыпе не мяняецца, і іх небяспека для грамадства не становіцца меншай.

Рэкет па-гродзенску

У Гродзенскай вобласці ў мінулым годзе зарэгістравана ўдвая больш фактаў вымагання. Займаюцца ім, у асноўным, дзве катэгорыі: «сінія» — раней судзімыя, якіх так называюць з-за вялікай колькасці татуіровак, і «быкі» — былыя спартсмены, што свядома сталі на шлях здабычы лёгкіх і вялікіх грошай. Месца збору першых — рэстаран «Гродна», другіх — рэстаран «Турыст». У гэтых «шынках» трацяць грошы і хлопцы з камерцыйных структур, у тым ліку і раней судзімыя, якія адышлі ад крымінальшчыны і заняліся вялікім бізнесам.

За чаркай каньяку, пад прыглушаную музыку ідзе наём баевікоў, якія дапамагаюць новаяўленым камерсантам выбіваць прыбытак з партнёраў і кліентаў, патрабаваць своечасовай платы даўгоў. Тут жа абмяркоўваюцца аперацыі, каго «патрэсці», каго якой «данінай» абкласці. У выніку гэта рэалізуецца на практыцы. Прычым дзёрзкасць, цынізм, з якімі робяцца такія злачынствы, здзіўляе нават супрацоўнікаў праваахоўных органаў.

Вось толькі два прыклады. У чэрвені мінулага года Н. Косцікаў разам з А. Лудзіным сустрэлі на вуліцы рабочага Гродзенскага завода аўтамагнітол Е. Зянько. Патрабавалі, каб ён украў з завода 20 аўтамагнітол і перадаў ім на працягу месяца. Для таго, каб не заставалася сумнення, што гэта не жарты, нанеслі Зянько ўдары кулакамі і нагамі па твары, выбілі зуб, разанулі нажом.

18 жніўня Косцікаў і Лузін уварваліся ў адну з кватэр па вуліцы Пралетарскай у г. Гродна, пабілі там А. Шавеля і Р. Даўгіліса, наносячы ім удары кулакамі, нажом, табурэткай і моцна паліваючы ахвяры нервова-паралітычным газам. Забраўшы плеер і касеты, якія належалі А. Шавелю, яны павялі з сабой і яго. У Р. Даўгіліса ж патрабавалі ў тыднёвы тэрмін перадачы ім 600 тысяч рублёў, пагражаючы ў адваротным выпадку забіць А. Шавеля. Апошняга прывязалі да рукі А. Лузіна і вадзілі па горадзе, а потым прывялі яго на кватэру, дзе насільна пакінулі начаваць. Раніцай 19 жніўня ён быў вызвалены работнікамі міліцыі.

ДАРЭЧЫ, ДА СПРАВЫ КОСЦІКАВА мы яшчэ вернемся. А пакуль...

«Антырэкеціры»

У гэтай якасці прыходзіцца выступаць супрацоўнікам Гродзенскага аддзела па барацьбе з арганізаванай злачынасцю, бо, апрача мноства іншых абавязкаў, барацьбой з рэкеціранмі, у першую чаргу, займаюцца яны. А гэта патрабуе не проста высокай прафесіянальнай падрыхтоўкі, але і вялікай асабістай мужнасці, адданасці справе, якой служаць. На гэтым, уласна кажучы, і трымаецца аддзел.

Яго начальнік Віктар Жарабіла нават знешне падобны на камісара Катані. Прафесіяй сышыка захапляўся з дзяцінства. Служыў ва ўнутраных войсках, пры затрыманні злачынцы быў паранены. Шмат гадоў працаваў у крымінальным вышуку. Гэткі ж добры спецыяліст і яго намеснік — Алег Танкевіч, які пятнаццаць гадоў аддаў аператыўнай рабоце.

«Светлая галава, аддадзены справе» — такое пачуў пра старшага следчага па асабліва важных справах Анатоля Анішчыка. І не толькі ад непасрэдных калег, але і ад супрацоўнікаў абласной пракуратуры.

У аддзеле 14 чалавек. Сярэдні ўзрост — 29 гадоў. Двое жывуць у інтэрнаце, іх сем'і — у іншых раёнах. Перспектыў на атрыманне жылля ў бліжэйшы час ніякіх. У аднаго супрацоўніка ў асабістым карыстанні «Запарожац», у дваіх — старэнькія «Масквічы». Астатнія — без «коней».

З памяшканнем значна горш. Памяшканні даюць багатым. Відаць, таму насупраць кабінетаў аператыўнікаў размяшчаецца кааператыў. Рабочыя месцы супрацоўнікаў аддзела можна назваць толькі ўмоўна: далі былы «ленінскі пакой» абласвета «Дынама», а потым уласнымі сіламі падзялілі яго перагародкамі... На ўсіх 14 работнікаў аддзела — 1 тэлефон.

І ўсё ж, нягледзячы ні на што, працуюць. Нядаўна, напрыклад, затрымалі групу рэкеціраў, якія дзейнічалі на чыгуначным вакзале ў Гродна, на станцыях Парэчча, Скідаль, Масты. Хлопцы ў гэтай «камандзе» падабраліся хоць куды — майстры спорту, прызёры былога Саюза і Еўропы. Паспрабуй, не задаволь «просьбу» такога.

Цяпер трое з гэтай злачыннай групы знаходзяцца ў следчым ізалятары г. Гродна. З адным з іх, разам з работнікамі пракуратуры і следчым, давялося мець гутарку. Нахабны, самаўпэўнены, з пастаяннай усмешкай на твары, усё адмаўляе. Патрабуе, каб яму змянілі рэжым утрымання, улічваючы, што ў арміі ён быў выдатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі і, будучы майстрам спорту, абараняў спартыўны гонар Радзімы... Чакае прыезду адваката з Мінска. Свае абаронцы, відаць, слабаватыя. І сродкі для «выпіскі» сталічнага адваката ёсць.

Пакуль чарговая група масцітых вымагальнікаў чакае суда, «працуюць» іх вучні. Супрацоўнікамі аддзела затрыманы навучэнец сярэдняй школы, які пад пагрозай забойства патрабаваў перадачы грошай — 5 тысяч рублёў. Прычым сума незаплачаных ва ўстаноўлены тэрмін вымагальніцкіх грошай штодзённа расла. Называецца гэта «паставіць на лічыльнік»: не аддасі сёння — праз месяц заплаціш у дзесяць разоў больш. Вось такая перспектыва, магчыма, чакае нас у бліжэйшы час, бо звяртаюцца ў міліцыю з выпадку пагроз зусім нямногія. А перашкаджае гэтаму —

Страх

Механізм расследавання вымагання вельмі няпросты. Абавязковая ўмова — паказанні пацярпеўшага. Тут і ўзнікаюць праблемы.

Даўно наспела неабходнасць вылрацаваць і заканадаўча прыняць меры па абароне сведак. На Захадзе яны абаронены сацыяльна, могуць змяняць месца жыхарства, дакументы, нават знешнасць. У нас жа на рукі падсудную выдаецца абвінавачанне заключэнне з прыкладаннем спісу пацярпеўшых і сведак, з іх хатнімі адрасамі. Інакш, як здзекамі з разважнага сэнсу, гэта назваць нельга.

Ёсць і яшчэ далікатныя абставіны, якія ўплываюць на расследаванне спраў аб рэкеце.

«Абшчак» дзейнічае!

«Абшчак» — гэта каса, банк, куды сцякаюцца грошы, атрыманыя ад злачыннай дзейнасці. Нават дробны злодзей лічыць за гонар аддаць туды частку свайго «заработку», каб у выпадку неабходнасці пакарыстацца паслугамі касы. Частка сродкаў з яе прызначана для подкупу работнікаў праваахоўных органаў. Вось з якімі дакументамі давялося пазнаёміцца ў Гродна: Начальніку Ленінскага РАУС г. Гродна палкоўніку міліцыі Савошчыку А. А.

РАПАРТ

Даладваю, 9 красавіка 1992 года я нёс службу па ахове падсудных у народным судзе Ленінскага раёна г. Гродна. У час заканчэння судовага пасяджэння адвакат Шуманская перадала без дазволу падсуднаму Косцікаву запіску, яная прыкладаецца да рапарта.

Міліцыянер-кавалер ст. сяржант міліцыі Валюшка С. С.

Цікавы і змест запіскі, яная прызначалася Косцікаву:

Узяць напрыклад, групу рэкеціраў з ліку былых спартсменаў, пра якую ўпаміналася вышэй. Дасканала вядома, што вымаганне на чыгуначным вакзале і вузлавых станцыях было з іх боку справай звычайнай. І пацярпеўшых ад гэтага нямала. А вось заяў паступаюць адзінкі. Людзі баяцца. І для гэтага ёсць прычыны.

У Злучаных Штатах асобных сведак можна не выклікаць у суд. Калі сведка даў пісьмовае паказанне і іх падмацаваў пячаткай у міністэрстве юстыцыі, тады ён можа не з'яўляцца ў зале суда. А ў нас? Супрацоўнікі аддзела ўспамінаюць, як праходзіў працэс па справе М. Дзюрдзя. Ужо тройчы судзімы, ён арганізаваў злачынную групу, члены якой займаліся вымаганнем, пагражаючы насіллем, забойствам.

На першае пасяджэнне суда прыйшлі сябры Дзюрдзі з біцэпсамі амаль як у Арнольда Шварцэнегера. Яны ўселіся ў першых радах і ледзь суддзя пачала чытаць абвінавачанне заключэнне і называць прозвішчы сведак, як у зале пачулася: «Ну, з вамі, сукі, усё ясна».

«Коля! Мне што паказваць? Здаваць мне Пашку, што ў Талпіна была, гаварыць або наогул маўчаць? Пра Кукса што казаць? Адказ перадасі заўтра раніцай. Душмана мы не пасадзім. Запіску маю спалі. Перадай Ваньку і ўсім, каб запіскі не клалі пад лаўку ў судзе. Ваньку перавод — няхай атрымае ланцужок залаты, Маху — пярсцёнак залаты».

І тым не менш старшыня прэзідыума калегіі адвакатаў В. Чэрнік па-свойму адрэагаваў на паведамленне з міліцыі:

«Учынак адваката Шуманскай Л. І. быў прадметам абмеркавання на сходзе адвакатаў юрыдычнай кансультацыі Ленінскага раёна г. Гродна. Адвакаты аднагалосна асудзілі няправільныя дзеянні т. Шуманскай, хадайнічалі перад прэзідыумам не прыцягваць яе да адказнасці».

Залішнюю мяккасардэчнасць у адносінах да рэкеціраў праяўляюць і суды. Так, 11 кастрычніка мінулага года ў час перадачы вымагальніцкіх грошай супрацоўнікамі Гродзенскага аддзела па барацьбе з арганізаванай злачынасцю быў затрыманы ў Смаргоні В. Алейнікаў — трэнер секцыі па ўсходніх відах адзінаборства. І вось які прыгавор народнага суда Смаргонскага раёна 4 лютага 1992 года:

«Абмяркоўваючы пытанне аб прымяненні да падсуднага меры пакарання, суд улічвае асобу падсуднага, абставіны ўчыненага ім злачынства, станоўчую характарыстыку з месца работы і лічыць, што яго выпраўленне і перавыхаванне магчымае без ізаляцыі ад грамадства».

«Перавыхаванне» В. Алейнікава «без ізаляцыі ад грамадства» не працягнулася і двух месяцаў. І красавіка ён наладзіў «дзень смеху»: сярод белага дня разам з сябрукамі ўчыніў разбойны напад на адну з кватэр у Смаргоні. У пацярпеўшага яны дамагаліся 100 тысяч рублёў...

Ці не таму рэкеціры так вольна адчуваюць сябе. Чаго варты свайго роду «пратакол» зладзейскай сходкі крымінальнага свету Гродзеншчыны з удзелам іх «калег» з Літвы:

«Слухалі: паведамленне аб актывізацыі работы супрацоўнікаў аддзела па барацьбе з арганізаванай злачынасцю, у выніку чаго за краты трапіла лепшая частка «братвы».

Паступілі прапановы:

1. Падкупіць нага-небудзь з супрацоўнікаў.

2. Фізічна ліквідаваць аднаго з работнікаў аддзела.

Вырашылі: з-за немагчымасці подкупу супрацоўнікаў і нежадання рабіць «бязмежжа» ў адносінах да «операў», эдхіліць абедзве прапановы».

Дадаць да гэтых дакументаў можна толькі адно: адзіночкі-энтузіясты з «хроснымі бацькамі» злачыннага свету, іх «абшчакамі» і ўсё ўзрастаючымі карумпіраванымі сувязямі не справяцца. Тут патрэбны комплексная даяржаўная праграма, Закон аб барацьбе з арганізаванай злачынасцю, тэрміновая і важкая дапамога парламента і ўрада рэспублікі праваахоўным органам.

Вячаслаў ОСЬКІН,
старшы оперупаўнаважаны па асабліва важных справах Упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачынасцю МУС Рэспублікі Беларусь, падпалкоўнік міліцыі.

РАСЛІНЫ І ЗДАРОЎЕ

Гарлачык жоўты

НАРОДНЫЯ НАЗВЫ: гарлачыкі, глячыкі, банкі, булдоўка, вадзяныя жбанкі, лілея, плывунцы жоўтыя, жоўтая вадзяная лілея, кубышка.

На Беларусі сустракаецца паўсюдна, ва ўсіх азёрах, сажалках, па затоках, часта ўтварае зараснікі.

Летам на паверхні азёраў, сажалак, павольных рэк спакойна плаваюць рэдкай прыгажосці адзіночныя, шарападобныя буйныя жоўтыя кветкі, акружаныя аялікім плоскім лісцем. Гэта гарлачык жоўты, вадзяная плавальная расліна з падводнымі сцябламі да 2—3 м даўжыні.

Карэнне таўшчынёй 3—10 см, мясістае, даўжынёй да 1—2 м, гарызантальнае, жаўтавата-зялёнае, на зломе белае, пакрыта рубцамі ад лісця (штогод адмірае), прымацоўваецца да дна шматлікімі тонкімі каранямі, якія глыбока ідуць у зямлю.

Лісце буйное, да 20—25 см у папярочніку, ля асновы сэрцападобнавыразанае. Трымаецца на вадзе пры дапамозе доўгіх (да 3 м) чаранкоў.

Цвіце ўсё лета—з мая да верасня. Кветкі адзіночныя, з мноствам палёсткаў і тычынак, буйныя, да 4—6 см у дыяметры, жоўтыя, своеасаблівага прыемнага паху.

Плады—ягадападобныя зялёныя гарлачыкі, акружаныя неапалымі чашалісцікамі. Насенне эліптычнае, зялёнае, размяшчаецца на паветранасным мяшку, пры яго дапамозе расплываецца на далёкую адлегласць.

Кветкі гарлачыка жоўтага змяшчаюць гліказіды сардэчнага дзеяння, накшталт наперстаўкі. У пладах шмат крухмалу, танінаў. У карэнішчах і каранях, знойдзены дубільныя, горкія, смалістыя рэчывы, крухмал, сумесь алкалоідаў—нуфарын, нуфарыдзін, лютэкурын, цукры, арганічныя кіслоты.



У ГАСПАДАРЦЫ

выкарыстоўваюць карэнне гарлачыка жоўтага ў барацьбе з тараканамі.

ПРЫ ХАРЧАВАННІ

выкарыстоўваюць карэнне і насенне гарлачыка жоўтага. У сырым выглядзе карэнне не ўжываюць. Пры прыгатаванні ежы неабходна захоўваць пэўныя правілы: карэнне ачышчаюць ад лушпінаў, адварваюць у салёнай вадзе, пры гэтым яно траціць горыч, ядавітасць, становіцца прыдатным для ежы.

Мука з карэння гарлачыка жоўтага. Карэнне старанна прамыць халоднай вадой, ачысціць ад лушпінаў, парэзаць на кавалкі даўжынёй 5—10 см. Для выдалення горычы парэзанае карэнне вымачыць у халоднай вадзе (некалькі разоў мяняць яе праз 10—12 гадзін), пасля высушыць, спачатку на паветры, пасля ў печы ці духоўцы і размалоць на муку. Муку з карэння заліць вадой (1 кг мукі, 5 л вады) на 3—5 гадзін, пасля ваду зліць і зноў заліць на 5—6 гадзін. Муку высушыць на драўляных дошках ці бавоўняных посцілках. Выкарыстоўваць як дабаўку ў цеста для хлебабулачных вырабаў.

Запраўка з гарлачыка жоўтага. Муку з карэння гарлачыка жоўтага змяшаць з парашком з сушанай крапівы і молатым кропам. Захоўваць у цёмным, халаднаватым месцы. Выкарыстоўваць для запраўкі першых і другіх страў.

200 г мукі з гарлачыка жоўтага, 100 г парашку з кропу, 100 г парашку крапівы.

Кававы напітак з гарлачыка жоўтага. Насенне гарлачыка ачысціць ад пабочных прымесей, пасмажыць, здрабніць у кавамолцы ці ступе. У кіпень пакласці парашок, праварыць на слабым агні 1—2 хвіліны, настойваць 10 хвілін, дабавіць смятанку ці малако, цукар або мёд.

5—10 г парашку з насення гарлачыка, 200 мл вады, смятанка і цукар па смаку.

У НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЕ

выкарыстоўваюць карэнне і кветкі гарлачыка жоўтага. Яны аказваюць вяжучае, бактэрыцыднае, болесуцяшальнае, жаўцягоннае, мачагоннае, лёгкае снатворнае, супакойвальнае дзеянне, узмацняюць рост валасоў.

Трэба памятаць: гарлачык жоўты — расліна ядавітая. Ужываць для лячэння неабходна толькі па назначэнню ўрача, строга захоўваць паказаныя дозы і тэрмін лячэння.

Настой кветак гарлачыка. 20 г кветак гарлачыка жоўтага настойваць у 1 л кіпеню, працадзіць. Ужываць па 1 сталовай лыжцы 2—3 разы на дзень як супакойвальны, снатворны сродак.

Адвар з кветак гарлачыка. 40 г кветак гарлачыка гатаваць у 1 л вады 10 хвілін, настойваць 30 хвілін. Выкарыстоўваць для ванняў, абмываньняў, мыцця галавы.

Адвар з карэння гарлачыка. 20 г карэння адварваць у 500 мл піва 10 хвілін, працадзіць. Мыць галаву 1—2 разы на тыдні на працягу 1—2 месяцаў.

Адвар з карэння гарлачыка. 10 г карэння гатаваць на слабым агні 15 хвілін у 200 мл вады, настойваць 2 гадзіны, працадзіць. Ужываць па 20—30 кропель 3 разы на дзень пры запаленні нырак, мачавога пузыра, туберкулёзе лёгкіх.

40—50 г кветак гарлачыка загарнуць у марлю, апусціць у кіпень на 2—3 хвіліны. Прыкладваць да балючых месц пры ўдарах, рэўматызме, падагры.

Прамытае лісце гарлачыка прыкладваць на скуру пры рожыстым запаленні.

У гамеапатыі эсенцыю з карэння гарлачыка жоўтага назначаюць пры імпатэнцыі.

Супрацьпаказанні не выяўлены.

НАРЫХТОЎВАЮЦЬ карэнне гарлачыка жоўтага летам і ў пачатку восені. Нажом падразаюць карэнне, пасля выцягваюць яго рукамі, віламі, баграмі, адмываюць ад глею, адрэзаюць лісце, карэнне, старанна прамываюць халоднай вадой, разрэзаюць на пласцінкі, складваюць тонкім слоем (1—2 см) на паперу, тканіну ці нанізваюць на ніткі і падвешваюць. Крыху падвяльваюць, пасля высушваюць у печах, сушылках пры тэмпературы 50—60°С ці на гарышчах з жалезным дахам, адкрытых верандах, добра праветраных памяшканнях.

Высушанае карэнне хвалістае, таўшчынёй да 1 см, з цёмнымі рубцамі на месцах адмерлага і адрэзанага лісця. У сярэдзіне шэравата-жаўтаватага колеру, звонку — буравата-шэрае. Гаркаватага смаку, слабага паху. Тэрмін захоўвання не вызначаны.

Кветкі сушаць на паветры, у сушылках, печах, духоўках пры тэмпературы не вышэй 60°С.

Тэрмін захоўвання — 1 год.

ПРЫ НАРЫХТОЎЦЫ нельга знішчаць гарлачык жоўты ўвесь. Для аднаўлення зараснікаў неабходна пакідаць непашкоджанымі не менш як 10—12 працэнтаў раслін.

Ніна АЛЯКСЕЙЧЫК, Валер САНЬКО.

ДА КАГО ПЛЫВУЦЬ ДОЛАРЫ?

Згодна з данымі Дзяржкамстата, больш за ўсіх адпраўляе прадукцыі на экспарт салігорскае вытворчае аб'яднанне «Беларускалій». За паўгоддзе яно нагандлявала на 58.413 тысяч долараў ЗША. Далей ідуць магілёўскае аб'яднанне «Хімвалакно» (25.016 тысяч), Мінскі трактарны (15.504 тысячы), наваполацкае ВА «Палімір» (10.714 тысяч), Мінскі завод халадзільнікаў (10.698 тысяч)...

За студзень—чэрвень знешнегандлёвы абарот рэспублікі склаў 570 мільёнаў долараў, у тым ліку экспарт — больш за 384 мільёны, імпарт — каля 186. Беларуская прадукцыя ідзе ў асноўным (пералік даецца згодна з маштабамі паставак) у Польшчу, Швейцарыю, Аўстрыю, Германію, Вялікабрытанію, Югаславію, Італію.

Больш за ўсё імпартуецца прадукцыі таксама з Польшчы. За ёю ідуць Швейцарыя, Германія, Югаславія, Вялікабрытанія, Аўстрыя.

Нагадаем: для рэспублікі вельмі важна нарошчваць экспартны патэнцыял. Найперш трэба разлічыцца са сваёй часткай знешняга доўгу былога Саюза. Менавіта гэтым і тлумачацца суадносіны паміж экспартам і імпартам на карысць першага. І не толькі. Нам трэба як мага хутчэй інтэгравацца ў сусветную эканоміку, што надасць новую якасць усяму нашаму жыццю. Аднак пакуль што доля экспарту ва ўсёй вырабляемай у рэспубліцы прадукцыі па-ранейшаму нізкая, вагаецца ў межах 4 працэнтаў. Калі ставіць пытанне інакш: ці добра плывуць да нас долары?— адказаць на яго станоўча нельга. Слаба. Ва ўсякім разе сёння.

Кар. «Звязды».

Усходні гараскоп на наступны тыдзень

З ДЭЛІ перадае кар. ІТАР—ТАСС Сяргей БУЛАНЦАЎ.

Для Казярога жнівень будзе поўны галаваломак. Абстаноўка мяняецца настолькі хутка, што вы ледзь паспяваеце арыентавацца ў падзеях. На наступным тыдні вам запатрабуецца дапамога знатака ці вопытнага эксперта. Прыслухайцеся да самаадчування, асабліва калі ў вас сваволькнічае «матор» ці падскоквае ціск. Мілая дама, вы памерыліся замуж? Астролаг не раіць цешыць сябе ілюзіямі.

Вадалей уступае ў «шматабяцальны» жнівень. Вы даб'яцеся мэтаў, пастаўленых на гэты месяц. На наступным тыдні фінансавыя справы толькі радуюць. Калі партнёры не задавальняюць, расстаньцеся з імі без вагання, але падобраму. Нехта старанна «рые» пад вас. Жонка раптам заўважыць, што ў канфліктах са старэйшымі членамі сям'і вы не заўсёды на яе баку. Не абвастрайце абстаноўку.

Жнівень для **Рыб** — «месяц далейшага прагрэсу», мяркуе астролаг. Што ж датычыцца бліжэйшай перспектывы, то на вас расстаўлена мноства сетак: у наш час так шмат аматараў лавіць рыбку ў мутнай вадзе. 30 ліпеня ў гэтых адносінах самы небяспечны дзень. Памятайце прынцыповае адрозненне паміж словам і вераб'ём і старанна сачыце за сабой — цяжкі перыяд міне. Не ліце слёзы разам з тым, хто плачацца вам у камізэльку.

Авену планеты абяцаюць у цэлым спрыяльны жнівень. Не выключана, што ў бліжэйшыя дні вы сутыкнецеся з неабходнасцю прыняць адказнае рашэнне. Няхай бізнесмена не аслепіць яркае святло поспеху. Учарашнія студэнты, а цяпер дыпламаваныя юрысты і эканамісты атрымаюць цікавыя прапановы аб працаўладкаванні. Адзінокія жанчыны маюць шанц заключыць шчаслівыя шлюбныя сувязі.

Наступны тыдзень пакажа, што ў **Цяльца** жнівень будзе не самым спакойным месяцам. Рызыкуеце ўпадабніцца баксёру, які атрымаў накдаўн ад заведама слабага працўніка. Падымайцеся на ногі і наганяйце страчанае. У гэтым вам дапаможа блакітны колер, пазбягайце чорнага і серабрыстага. Калі жанчыну пастаянна далякае шэф, пабераўце нервы і кіньце работу — усё да лепшага.

Блізнятам жнівень абяцае напружаную занятасць. У фаворы свяціл — маладое пакаленне «блізнят». Прыкладна 28 ліпеня вам даручаць адказнае заданне. Поўныя сіл і энергіі, вы паспяхова справіцеся з ім раней назначанага тэрміну. У камандзіроўцы адбудзецца вельмі карыснае знаёмства. Адносіны паміж закаханымі, якія пасварыліся, наладзяцца. Ваш колер у жніўні — блакітны.

Жнівень падорыць **Раку** некалькі цудоўных дзён. Надыходзячы тыдзень стане сведкам вашага прывалага фінансавага стансвішча, высокіх спартыўных дасягненняў і творчых поспехаў. Мужчына, нарэшце, пакажа, на што ён здатны. Дзяўчына ажыццёвіць даўнюю мару і стане сцюардэсай. Нехта старанна дабіваецца збліжэння з вамі. Колеры поспеху — чырвоны і аранжавы.

Леў у жніўні адчуе сябе поўным сіл і аптымізму. Зялёны, бірузовы, бэзавы і ліловы колеры дапамогуць рэалізаваць новыя планы і магчымасці. Лепшы дзень на наступным тыдні — 28 ліпеня. Астролаг рэкамендуе звярнуць увагу на характар узаемаадносін з саслужыўцамі і дамашнімі — ім крыху не хапае гармоніі. Суботу і нядзелю трэба прысвяціць самым блізкім людзям.

Дзева ўступае ў спрыяльны жнівень на высокай ноце апошніх дзён ліпеня. Вы адладзілі механізм сваёй работы і можаце заняцца асабістымі справамі. На працягу тыдня будзе мноства сустрэч з роднымі. Разведзеныя забудуць горкі вопыт першага шлюбу. Астролаг пераканаўча рэкамендуе асаблівую асцярожнасць на вадзе. Колер марской хвалі дапаможа пазбегнуць небяспекі.

На долю **Шаляў** выпадуць напружаная праца і сімпатыі планет, якія 30 ліпеня падораць вам ва ўсіх адносінах спрыяльны дзень. Як уяўляецца астролагу, на працягу тыдня трэба вярнуцца да нейкай даўняй задумы, на якую вы махнулі рукой. Разлічыце ступень рызыкі і не слухайце дабразеяў, якія імкнуцца збіць вас з толку. Новае жаданне нараджае новыя праблемы. Каб удала справіцца з імі, жанчынам рэкамендуецца аранжавае ці жоўтае, мужчынам — белае.

Скарпіёну ў жніўні лепш за ўсё пайсці ў водпуск —планетная канфігурацыя загадвае адлачываць і займацца асабістымі справамі. Па ўсім відаць, на наступным тыдні разведзеныя набудуць другое дыханне. «Ваш новы саюз будзе цудоўным», — прачытаў астролаг у нябеснай кнізе лёсаў. Калі суджаны вельмі нерашучы, бярыце ініцыятыву ў свае рукі. Пры гэтым дамам трэба памятаць, што будучыя сем дзён вельмі спрыяльныя для зачацця.

Стралец, вам прадказваецца «ва ўсіх адносінах удалы месяц». Аднак у апошнія дні ліпеня вамі могуць авалодаць летуценні ў духу гогалеўскага Манілава. Спусціцеся з аблокаў ілюзіі, бо вяртанне да рэальнасці будзе хвараўтым. Жанчыне ў жніўні поспех прынясе жэмчуг. «Дзе ж яго ўзяць, калі і на шпількі грошай не хапае?» У адказ на ваша справядлівае пытанне астролаг прапануе альтэрнатыву — проста блакітны колер.

ЖЫЦЦЁ ПА ЗОРКАХ

Нябесныя целы, як выявілася, могуць не толькі асвятляць вам жыццёвы шлях, але і прадказаць, якой працягласці ён будзе. Карацей кажучы, сузор'і могуць паведаміць аб тым, колькі гадоў вы пражывеце.

Цяльцы-мужчыны і Блізняты-жанчыны жывуць больш за ўсіх. Так сцвярджае амерыканскі астролаг Скін Фіклінг. Ён параўнаў працягласць жыцця звыш 100.000 чалавек. У сярэднім атрымалася вось такая розніца паміж знакамі задыяка.

	мужчыны	жанчыны
Авен	80	79,5
Цяльц	83	80
Блізняты	71,5	82,5
Рак	67	74,5
Леў	75	77
Дзева	77	67
Шаль	76,5	78
Скарпіён	70	75
Стралец	65	66
Казярог	79	81,5
Вадалей	73	73
Рыба	73,5	77

● «ФЕАФАНІЯ, ЯКАЯ МАЛЮЕ СМЕРЦЬ»
● «ВОБЛАКА-РАЙ» ● «РЫЦАР-АДЗІНОЧКА»
● «ЦАНА ВАР'ЯЦТВА»

Фільмы тыдня

XII СТАГОДДЗЕ, РУСЬ. Жыхары невялікай вёскі ў ноч на яна наладжваюць, згодна языцкім звычаям, гульні...

Раніцай жа насельніцтва аблятае страшная вестка: знойдзена знявечанае цела маладой прыгажуні Ганны. Усе лічаць, што ля забіў пярэварацень... А аб тым, што адбылося потым, гледачы даведаюцца, паглядзеўшы каляровую мастацкую кінастужку **«ФЕАФАНІЯ, ЯКАЯ МАЛЮЕ СМЕРЦЬ»**, створаную сумесна кінематаграфістамі кінастудыі «Вавілон», Адэскай кінастудыі і кінакампаніі «Кодзіак» (ЗША). Аўтары сцэнарыя — Уладзімір Аленікаў, Юрый Пятроў і Кэтрын Марцін, рэжысёр — Уладзімір Аленікаў. Фільм можна аднесці да раднага жанру паэтычнага трылера, у якім пераплецены элементы дэтэктыву, філасофскай прытчы, любоўнай драмы і стужкі жахаў. Немалы ўклад у яго поспех уносіць цудоўная ігра вядомага амерыканскага акцёра Джорджа Сігала, які выканаў ролю аднаго з галоўных герояў.

Цікава праводзяць свае ролі танцамі Тамара Тана, Мікалай Качагараў, Віктар Рэпнікаў, Наталля Сіланцьева, Таццяна Новік, Марыя Каралёва і іншыя.

З цікавасцю глядзіцца танцама новая каляровая мастацкая кінастужка **«ВОБЛАКА-РАЙ»**, вытворчасці кінастудыі «12А» пры ўдзеле «Масфільма». Аўтар сцэнарыя — Георгій Мікалаеў, рэжысёр-пастаноўшчык — Мікалай Досталь.

Гэта гісторыя — сапраўдная, хоць вельмі падобная на прытчу, таму што кожны вольны не разумець па-свойму.

...У маленькім глухім гарадку жыў-быў хлопец, які не ведаў, куды яму дзець сваё жыццё. Ён бесталкова хадзіў па вуліцах, нудзіўся сваім бессэнсоўным існаваннем. І вось аднойчы абмовіўся суседу, да якога зайшоў, сумуючы, што едзе на Далёкі Усход. Да сябра. Працаваць.

Сонныя вочы суседа ажывіліся: «Калі?» — «Сёння. Вечарам».

Падзеі

Усё вакол закружылася ў нейкім фантастычным віхры. Хто нясе свой самы лепшы чамадан часоў асваення цаліны, хто развітальны абед «з нічога» збірае, і шкадуюць, і радуюцца, і глядзяць на хлопца з цікавасцю і нейкім унутраным заміраннем. Вось ужо мэблю бедную з яго пакойчыка вынеслі, і жыхара новага прывялі. А хлопцу і ёладка, і горна, і страшна. Аказваецца, ён можа быць некаму цікавы, нават патрэбны. Прызнацца ў падмане? Брыдка. І позна.

А можа, яно і лепш, што ўсё так абярнулася. Без радасці і сансу—якое ж гэта жыццё? Выпадковы падман ператворыцца ў рэальнасць, якая, глядзіш, пакрые яго на «воблака-рай», пра якое ён калісьці склаў песню і спеў яе на развітанне.

Галоўныя ролі выконваюць Андрэй Жыгалаў, Сяргей Баталаў, Ала Клюка, Ганна Аўсянікава, Леў Барысаў, Ірына Разанава і іншыя.

Каляровую мастацкую кінастужку **«РЫЦАР-АДЗІНОЧКА»** паставіў рэжысёр Сюй Вэйцзе па сцэнарыю Лі Сяо. На гэты раз кітайскія кінамайстры прапануюць гледачам вострае прыгодніцкае дзеянне, якое расказвае аб кровапралітай барацьбе паміж паслядоўнікамі вучэння «Белы лотас» і хітрым вяльможам па мянушцы Чорны Тыгр.

...Вялікі майстар Ян Дусін па мянушцы «Адзіночка» заўсёды верны свайму прынцыпу: ніколі не ўмешвацца ў справу, якая яго не датычыць асабіста. Таму ён адхіляе просьбу аб дапамозе, з якой звяртаецца да яго Лі Цяньчжоу, брат загінуўшага заснавальніка таварыства «Белы Лотас». Аднак горды рыцар смела ўступае ў бой, абараняючы свайго госця, калі ён падвергся нападу людзей Чорнага Тыгра. Але Лі Цяньчжоу ўсё ж гіне, выпіўшы атручанага віна. Ян Дусін не сумняваецца, што атруціць хацелі менавіта яго...

У фільме ёсць усё: і невераго дныя прыгоды галоўных дзеючых асоб, і цудоўныя пейзажы сярэднявяковага Кітая, і, вядома ж, фенамінальнае майстэрства рыцараў легендарнай барацьбы «кун-фу».

У галоўных ролях заняты Лі Мінцзянь, Чжэн Хуэй, Чжао Цзыжуй.

...Нялёгкім было жыццё двюх сёстраў. Бацькі не мірыліся адзін з адным, і таму ў доме не змаўкалі крыкі, сварні і звон бітага посуду, пакуль яны не разышліся і не раз'ехаліся ў розныя бакі. Дочкі не паехалі за імі, застаўшыся ў родным правінцыяльным гарадку. Пасталеўшая Цяньцінь уладкавалася працаваць акушэркай у раддом і ўзяла на сябе ўсе клопаты па выхаванню малодшай — Ланьлань. Дружба і пяшчотная прыхільнасць сёстраў была такой шчырай, што Ланьлань аднойчы прызналася аднакласнікам: імшы раз ёй здаецца, быццам нарадзіла яе не маці, як усіх астатніх, а сястра.

Усё рухнула ў адзін вечар. Ланьлань вярталася дамоў пасля ўроку, ужо сцямнела. Аўтамабіль, які праязджаў побач, запырскаў яе школьную сукенку. Быццам раскайваючыся, вадзіцель прапанаваў падвезці дзяўчынку да дому. У машыне школьніца была згвалтавана...

Цяньцінь ледзь не страціла розум ад гора, яна ўзялася сама знайсці гвалтаўніка і адпомсціць яму... Аб тым, як развіваліся падзеі далей, вы і даведаецеся, паглядзеўшы каляровую кітайскую мастацкую кінастужку **«ЦАНА ВАР'ЯЦТВА»**. Аўтары сцэнарыя — Чжоу Славэнь, Лу Вэй, рэжысёр — Чжоу Славэнь.

На здымку: кадр з фільма «ЦАНА ВАР'ЯЦТВА».

Багатыя на фантазію вырабы народнага ўмельца з Браслаўшчыны Мікалая ФЕЯ. Яго вабіць грацыёзнасць, пластыка лясных жыхароў, асабліва ўдаюцца майстру складаныя кампазіцыі на тэмы казак. Творы ўмельца можна ўбачыць у мясцовым музеі, буйнамаштабная разьба па дрэву ўпрыгожвае дзіцячы гарадок калгаса «Беларусь».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

КРЫЖАВАНКА—ПЕРАКЛАД



Перакладзіце на беларускую мову наступныя словы.

Па гарызанталях: 7. Горничная. 8. Путаник. 9. Шлем. 11. Честь. 12. Кучка. 14. Вилы. 15. Подберёзовик. 16. Квитанция. 18. Бездельник. 19. Горожанин. 21. Странник. 24. Гончая. 25. Скорняк. 26. Фитилёк. 28. Ребёнок, дитя. 29. Гамаша. 31. Косяк, притолока. 32. Громкий смех. 33. Хозяин. 34. Ивняк, чернотал.

Па вертыкалях: 1. Великолепие. 2. Хорёк. 3. Ломтик (хлеба). 4. Улитка. 5. Укоризна. 6. Сизоворонка. 10. Сено (луговое). 1. Горн. 13. Обвешивание. 14. Кустарь. 17. Корягв. 18. Числитель. 20. Горшочек. 21. Пояс, ремень. 22. Сундук. 23. Беспокойство. 26. Ястреб. 27. Воротник. 28. Обезьяна. 30. Шелест.

Склаў Рыгор ЯКУШ.
г. Мінск.

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗМЕШЧАНУЮ 27 ЧЭРВЕНЯ

СУБОТНІМ ВЕЧАРАМ



КРЫПТАГРАМА

Яе даслаў у рэдакцыю Мікола Ворчык з вёскі Гайна Лагойскага раёна. Карыстаючыся ключавымі словамі, прачытайце ў клетках малюнка зашыфраванае вядомае выказванне Міхаіла Прышвіна аб прыродзе.

а) 1, 2, 3, 4 — запруда на рацэ; б) 5, 6, 7, 8, 9, 10 —пэўны прамежак часу; в) 11, 6, 12, 2, 13 — горад у Падмаскоўі; г) 14, 15, 16, 17, 5 — сукупнасць практычна засвоеных ведаў, звычак, умельства; д) 18, 7, 19, 20 — раздроблены камень або цэгла.

ДАКЛАДНЕЙ, ЯШЧЭ ДАКЛАДНЕЙ!

У Бібліі апавядаецца, як па загаду цара Саламона быў зроблены круглы медны сасуд дыяметрам у 10 локцяў і акружнасцю ў 30 локцяў. Значыць, чысло пі (адносіны акружнасці да яе дыяметра) пры тагачаснай дакладнасці вымярэнняў прымалі роўнай тром.

Старажытнаегіпецкія землямеры і архітэктары лічылі, што даўжыня акружнасці больш яе дыяметра ў 3,16 раза. Старажытныя рымляне памыляліся ў другі бок — яны лічылі чысло пі роўным 3, 12. Але для тых часоў такая дакладнасць зусім дастатковая.

У XVI стагоддзі чысло пі было разлічана ўжо да 35 знакаў пасля коскі. А яшчэ праз стагоддзе дакладнасць была даведзена да 707 знакаў англійскім матэматыкам У. Шэнксам.

Калі ж з'явіліся першыя ЭВМ, разлік усё новай і новай дакладнасці чысла пі стаў своеасаблівым спаборніцтвам на якасць работы вылічальнай тэхнікі. Была пойдзена, дарэчы, недакладнасць у разліках У. Шэнкса. А самае галоўнае, чысло пі ў 1962 годзе было разлічана да 100 000 знакаў пасля коскі, у 1973 годзе —да мільёна знакаў, а ў 1982 годзе японскія вучоныя, відаць, з мэтаю трапіць у кнігу рэкордаў Гінеса, разлічылі чысло пі да 16 мільёнаў знакаў.

Самае цікавае аднак заключаецца ў тым, што для самых дакладных інжынерных разлікаў дастаткова ведаць толькі 5—6 знакаў пасля коскі. А ўсе астатнія — гэта толькі шчыра кажучы, своеасаблівая гульня ў дакладнасць.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

25 ліпеня

Беларускае тэлебачанне

11.00. Тыдзень планеты.
11.15. «Угледзецца ў твар...» Аўтарская песня Ю. Бельскага.
11.45. Дзівосны свет. Жыццё пражыць?
12.05. 20 мінут рэдактара. Па пісьмах гледачоў.
12.25. На музычных паралелях. Іграе Томас Тарына (фартэпіяна) (ЗША).
13.15. «Суперкніга». Мультфільм. 12-я серыя.
13.50. «Знікшыя сведкі». Маст. фільм з субцітрамі.
15.15. ПІК. Пазнавальна-інфармацыйны канал для школьнікаў.
16.35. Я і мы. Грамадска-публіцыстычная праграма.
17.30. «Да вас, сучаснікі мае...» Фільм 1-ы.
18.30. Мультфільмы.
18.50. Песні з-за кратаў. Вечарына, прысвечаная творчасці паэта С. Новіка-Пяюна.
19.50. Процістаянне.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.30. Маст. фільм «Жыццё ў пазыку». (ЗША).
23.10. НІКа.

І канал. Астанкіна

11.05. «Каб свечка не пагасла» (памяці Л. Гумілёва).
11.40. «Крэшчэндо». Музычная праграма.
12.05. Інстытут чалавека.
12.45. «Увага і дзесяты маладзёжны».
13.05. Прэм'ера мастацка-публіцыстычнага фільма «Чалавек або д'ябал?» Фільм 1-ы «Жывыя хронікі».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Маст. фільм «Лёгкія кроі».
16.05. КВЗ-92. Чвэрцьфінал сезона «Алімпійскія гульні».
17.50. Мультфільм.
18.00. Маст. фільм «Прыватнае жыццё Лізаветы і Эсекса» (ЗША).
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Рэпартаж ні аб чым.
20.55. Урачыстае адкрыццё XXV летніх Алімпійскіх гульняў.

Канал «Расія»

12.00. Рамансы на вершы Ганны Ахматавай.
12.15. Пілігрым.
13.00. Весткі.
13.20. «Вертыкаль». Маст. фільм.
14.35. Фермер—фермеру. У перадачы ўдзельнічаюць Ю. Чарнічэнка, В. Сялюнін і фермеры Падмаскоўя.
15.35. Вінілавыя джунглі.
16.05. Парыжскія дыялогі. Сустрэча 2-я. Уладальнік магазіна рускай кнігі Г. Г. фон Брунс.
16.30. «Джэнтльмен-шоу».
17.00. «Залатая шпора».
17.30. Парламенцкі веснік.
17.45. Тэатральны раз'езд. Наталля Макарава і Раман Вікцюк.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Міжнародны конкурс папулярнай музыкі «Юрмала-92».
20.50. «Экспацэнтр» прадстаўляе.
21.00. Зусім сакрэтна.
22.00. Весткі.
22.20. З залы Канстытуцыйнага суда Расіі.
22.50. Праграма «А». «Рок-самер-92». Горад Талін.

26 ліпеня

Беларускае тэлебачанне

8.55. Уроні здароўя. Кантроль і самакантроль за станам здароўя.
9.20. «Ляцяць жураўлі». Маст. фільм.
10.55. «Не жадай зла, злом павернецца». Аб дабрыні душэўнай.
11.15. Час пісьма.
11.45. Гэй, гай, «Таўкачыкі»! Выступленне фальклорнага калектыву Смалянскай школы Віцебскай вобласці.
12.30. «Савітар-цэнтр». Саша Варламаў: твой імідж.
13.00. НІКа. Ядзерныя дадатак.
13.45. Фант-клуб.
14.30. Майстры оперных сцэны.
15.40. «Аб'ектыў-тэатр» на міжнародным фестывалі «Балтыйская тэатральная вясна-92».
16.40. «Для вас, сучаснікі мае...» Фільм 2-гі.
17.50. Духоўна-рэлігійная праграма.
18.50. «З пакаёвелка...» Адпачынак пачынаецца з усмешкі.
19.20. Запрашаем на вячорні.
20.00. Панарама.
20.25. «І зноў пра каханне...» Артыстка І. Нарбекава чытае замежную лірыку ў перакладах беларускіх паэтаў.
20.40. Калыханка.
21.00. Заўтра — Дзень незалежнасці. Выступленне старшыні ВНФ народнага дэпутата РБ З. С. Пазьняка.
21.20. Маст. фільм «Правасуддзе для ўсіх» (ЗША).
23.00. Дзяржстрах, які ён ёсць.
23.20. Каралеўскае паляванне. Шоу-кавіно.

І канал. Астанкіна

6.00. Гадзіна сілы духу.
7.00. Рытмічная гімнастыка.
7.30. Тыраж «СпортлатО».
7.45. Раным-рана.
8.20. Магчыма ўсё.
8.55. Новыя імёны.
9.45. IX Міжнародны фестываль тэлепраграм народнай творчасці «Вясёлка». «Песні затопленай вёскі» (Чэха-Славакія).
10.15. Пад знакам «пі».
11.05. Народныя казкі і прытчы розных краін. «Тры сястры» (Францыя).
11.10. Новае пакаленне выбірае.
12.00. XXV летнія Алімпійскія гульні. Плаванне. Веласпорт.
13.00. Дак. фільм з серыяла «Запаведнікі дзікай прыроды». Фільм 9-ы.
13.30. Маст. фільм «Марк і Сафі». Фільм 9-ы.
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
15.00. Залатыя россыпы. «Ніжагародскі разгуляй».
15.25. Клуб падарожнікаў.
16.15. Панарама.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.00. «Праменад у Марыінскім».
19.00. Маст. фільм «Бывай, Рафаэль!» з крымінальнага серыяла «Паляўнічыя на шедэўры» (Італія).
20.00. XXV летнія Алімпійскія гульні. Бокс. Стральба. Плаванне.
21.00. Выніки.
21.45. «Сёння». Рэлігійная праграма.
23.00. Навіны.
23.20. XXV летнія Алімпійскія гульні. Цяжкая атлетыка. Спартыўная гімнастыка. Бокс. Веласпорт.
1.20. «Абвінавачваецца аперэта».

Канал «Расія»

17.15. «Каралі для маёй каханай». Маст. фільм.
18.25. XXV летнія Алімпійскія гульні. Веласіпедны спорт. Групавая гонка.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. XXV летнія Алімпійскія гульні. Працяг.
21.00. Міжнародны конкурс папулярнай музыкі «Юрмала-92».
22.00. Весткі.
22.20. Міжнародны конкурс папулярнай музыкі «Юрмала-92».

Наступны нумар газеты «Звязда» выйдзе ў сераду, 29 ліпеня г. г.

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАУЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда».
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін —32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах —32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.
Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 61.098. Індэкс 63.850. Зак. № 148.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12